


МАТЫВАЦЫЯ ПРАЗ ГЕЙМІФІКАЦЫЮ
ЧЫРВОНКА

«ВАЛАНЦЁРСТВА», З ЯКОГА ЎСЁ ПАЧАЛОСЯ
ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 СТУДЗЕНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 16 (29385)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Андрэй КАСОЎСКІ:**

*«У 2020 годзе падрыхтаваны праект дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады. У новую дзяржпраграму ўвойдуць праекты па самых розных кірунках: ад лічбавых тэхналогій і машынабудавання да медыцыны і сельскай гаспадаркі. Па выніках праграмы плануецца стварыць больш за 12 тысяч новых рабочых месцаў і дасягнуць паказчыкаў інавацыйнага развіцця, якія адпавядаюць узроўню краін—лідараў рэгіёна Усходняй Еўропы (Чэхіі, Венгрыі, Славакіі). Па новай дзяржпраграме плануюць рэалізаваць больш за 100 інавацыйных праектаў...»*

## КОРАТКА

- **У Беларусі з 1 лютага павысіцца памер бюджэту пражытковага мінімуму.**
- Першая ў Беларусі лабараторыя па аналізе прадукцыі з нікацінам створана ў Беларускім дзяржаўным інстытуце метралогіі.
- **Адкрыты Кубак Беларусі па сучасным пяцібор'і пройдзе ў Гомелі 29—31 студзеня.**
- У Беларусі зарэгістравалі ўласную пароду кароў.
- **Цэнтр рэабілітацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў у Віцебску вярнуўся да звычайнага рэжыму работы.**
- Вялікі тэатр пакажа знакавыя спектаклі да юбілею народнага артыста Беларусі Уладзіміра Пятрова.
- **У Гродне сям'і ветэрана вярнулі раней страчаную баявую ўзнагароду.**

ISSN 1990 — 763X
21016
9 771990 763008

# Натуральнае і віртуальнае



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінская школьніца малодшых класаў Яна МЯСНІКОВА на экскурсіі ў прыватнай гаспадарцы жыхара Слуцка Сяргея КРАСУЦКАГА, які гадуе парсючкоў, трусоў, козачак і перапёлак.

Перспектыва

## Драйверы росту Гродзеншчыны

**Як рэгіён плануе пачаць першы год пяцігодкі і развівацца надалей, расказаў «Звяздзе» намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь НЯВЕРА.**



grodnonews

Згодна з праектам Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку, перад краінай стаяць даволі амбіцыйныя задачы. Гэта і значны рост ВУП, і рост інвестыцый, і нарошчванне экспарту, і павелічэнне даходаў насельніцтва. Гродзеншчына — не выключэнне.

СТАР. 4

Побач з намі

## ВЫКЛІКІ ЧАСУ: COVID-19 І НЕ ТОЛЬКІ

### Беларускі Чырвоны Крыж працягвае аказваць дапамогу падчас пандэміі і іншых надзвычайных сітуацый

**Падчас распаўсюджвання COVID-19 Беларускі Чырвоны Крыж стаў той арганізацыяй, якая імгненна ўключылася ў дапамогу людзям. Каля мільёна чалавек атрымала падтрымку ў выглядзе прадуктовых набораў, ваўчараў, якія можна было «атаварыць», грашовых сродкаў, дастаўкі прадуктаў на дом, а таксама простай размовы па тэлефоне «гарачай лініі» са спецыялістам.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Гэтымі днямі Беларусь наведвае **выконваючы абавязкі кіраўніка прадстаўніцтва Міжнароднай федэрацыі таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца ў Расіі, Беларусі і Малдове Аляксандр МАРДОВІН.** Ён расказаў, якая дапамога аказваецца нашаму нацыянальнаму таварыству з боку гэтай арганізацыі і які беларускі вопыт па рэагаванні на пандэмію аказаўся карысны для іншых краін.

СТАР. 10

Падзеі

# НОВЫ БЫЛЫ КІРАЎНІК

## Прэм'ер-міністр прадставіў калектыву новага старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіля Герасімава

**На пасаду старшыні гэтага ведамства Васіля Герасімава ў аўторак прызначыў Прэзідэнт. Раман Галоўчанка падкрэсліў выдатныя аналітычныя здольнасці новага кіраўніка КДК, а таксама пачуццё высокай адказнасці і прынцыповасць у адстойванні дзяржаўных інтарэсаў.**

Па словах Рамана Галоўчанкі, прызначэнне — ацэнка работы, якая была зроблена Камітэтам дзяржаўнага кантролю пад кіраўніцтвам Васіля Герасімава з верасня 2020 года, калі ён выконваў абавязкі кіраўніка ведамства. «На Камітэт дзяржкантролю былі ўскладзены асаблівыя задачы і функцыі, якія, як учора сказаў кіраўнік дзяржавы, былі рэалізаваны на высокім узроўні», — перадае словы прэм'ер-міністра БелТА.

Ён падкрэсліў, што наперадзе штодзённая работа па вырашэнні важных дзяржаўных пытанняў і бягучых задач КДК. Прэм'ер-міністр пажадаў Васілю Герасімаву поспехаў і выказаў надзею на канструктыўнае ўзаемадзеянне ведамства з Саветам Міністраў.

Навука

# Беспілотнік і электрамабіль «ACADEMIC ELECTRO»

**На выстаўцы дасягненняў і найбольш значных вынікаў навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці «Дзень беларускай навукі — 2021» арганізацыі НАН Беларусі прэзентуюць каля 200 новых распрацовак і тэхналогій. Экспанаты можна будзе ўбачыць 29 студзеня на пастаянна дзеючай выстаўцы «Дасягненні айчыннай навукі — вытворчасці» ў холе першага паверха будынка Прэзідыума НАН.**

Многія распрацоўкі будуць дэманстравацца ўпершыню. Так, навукова-вытворчы цэнтр шматфункцыянальных беспілотных комплексаў НАН Беларусі прадэманструе макет беспілотнага лятальнага апарата (БЛА) «Мішэнь». Беспілотны лятальны апарат з турбарэактыўным рухавіком прызначаны для імітацыі паветраных цэляў, такіх як рэактыўны баявы самалёт, крылатая ракета, БЛА для забеспячэння трэніровкі падраздзяленняў і часцей ВПС і войскаў супрацьпаветранай абароны. З'яўляецца першай мадэллю БЛА з рэактыўным рухавіком, распрацаванай на прадпрыемстве.

Аб'яднаны інстытут машынабудавання прадэманструе на адкрытай пляцоўцы макеты ўзор каркасна-панэльнага электрамабіля «ACADEMIC ELECTRO». Ён прызначаны для перавозак па закрытых тэрыторыях (без выезду на дарогі агульнага карыстання), разлічаны на двух пасажыраў. Максімальная хуткасць электрамабіля складае 50 кіламетраў у гадзіну. Каркасна-панэльны тып кузава дазваляе ажыццяўляць выпуск мадэлі дробнымі серыямі пад патрабаванні заказчыка.

Інстытут лесу НАН Беларусі прадставіць біялагічны метад абароны хваёвых насаджэнняў з выкарыстаннем ферамоннай пасткі для прыцягнення і інфіцыравання стваловых насякомых-шкоднікаў.

Усяго навукоўцы і даследчыкі краіны прадставяць на выстаўцы каля 400 інавацыйных навуковых распрацовак.

29 студзеня ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбудзецца рэспубліканскі сход навуковай грамадскасці, прысвечаны Дню беларускай навукі, які адзначаецца ў нашай краіне ў апошнюю нядзелю студзеня. Найлепшым вучоным і даследчыкам краіны будуць уручаны ўзнагароды.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**




# Канструктывізм, дзелавітасць і патрыятычнасць

## У такім ключы прайшло ў Магілёве абмеркаванне праекта праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на найбліжэйшую пяцігодку

**Магілёўскую вобласць на Усебеларускім народным сходзе будуць прадстаўляць 310 дэлегатаў. Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ падкрэсліў, што гэта дасведчаныя людзі, якія карыстаюцца аўтарытэтам у працоўных калектывах і вельмі добра ўяўляюць перспектывы развіцця як рэгіёна, так і краіны ў цэлым. Магілёўшчына актыўна ўдзельнічала ў абмеркаванні надзённых пытанняў на дыскусійных пляцоўках, у аргкамітэт сходу было накіравана больш чым 270 прапаноў. Некаторыя з іх ляглі ў аснову праекта праграмы.**

**Міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** адразу ж папярэдзіў, што праект — пакуль толькі контуры той канчатковай праграмы, якая будзе прынята пасля Усебеларускага народнага сходу з улікам заўваг і прапаноў з рэгіёнаў. Ён таксама падкрэсліў, што над распрацоўкай гэтага ўсёабдымнага дакумента на працягу двух апошніх гадоў працавала шмат экспертаў, у тым ліку больш чым сто профільных. Пры распрацоўцы праграмы вызначаліся яе стартавыя ўмовы — тое, што было дасягнута за папярэднія пяць гадоў.

Дзяржава працягне захоўваць сацыяльную накіраванасць, у рамках якой галоўная мэта — рост дабрабыту людзей. Асноўная ўвага будзе ўдзяляцца даходу і занятасці насельніцтва, даступнасці жылля, высокатэхналагічным паслугам у ахове здароўя і адукацыі. Акцэнт робіцца на развіццё новых тэхналагічных галін і прадпрыемстваў, лічбавізацыю, развіццё навукі, падтрымку вынаходніцтва і рацыяналізатарства, раскрыццё творчага патэнцыялу.



Фота БелТА.

У медыцыне плануецца рэалізацыя трох асноўных кірункаў: зніжэнне ўзроўню захваральнасці сярод насельніцтва і ўзмацненне эпідбяспекі. Асноўныя меры — правядзенне прафілактыкі, медыцынскія скрынінгі і дыспансерызацыя. Другі кірунак звязаны са стварэннем высокатэхналагічнай медыцыны ў рэгіёнах. За пяцігодку плануецца пабудаваць 12 міжрэгіянальных цэнтраў для аказання спецыялізаванай медыцынскай дапамогі. У Магілёўскай вобласці іх будзе два — у Касцюковічах і Бабруйску. Цэнтры плануецца аснасціць сучасным высокатэхналагічным абсталяваннем. «Лічбавізацыя медыцыны дапаможа ўкараніць адзіную тэлекамунікацыйную інфраструктуру аховы здароўя на базе 5G, — падкрэсліў міністр. — Гэта дасць магчымасць дыстанцыйна маніторыць здароўе і праводзіць высокатэхналагічныя аперацыі».

У будучай пяцігодцы стаўка робіцца таксама на ўмацаванне эканамічнага патэнцыялу і лічбавізацыю галін народнай гаспадаркі. Гэта будзе адбывацца за кошт росту даходаў насельніцтва, рэалізацыі дзяржпраграм і стымулявання набыцця тавараў айчыннай вытворчасці. Новы інвестыцыйны цыкл будзе садзейнічаць росту вытворчасці працы, павелічэнню канкурэнтаздольнасці і экспартных магчымасцяў. Змены ў знешніх умовах і ўзмацненне канкурэнцыі патрабуюць новых бізнес-мадэляў, узаемадзеяння бізнесу і прадпрыемстваў. Прапануецца аб'яднаць намаганні магутных кампаній, бізнесу, навукі і стварыць 13 кластараў у найбольш перспектыўных сферах. Яны будуць нацэлены на стварэнне новых прадуктаў і прасоўванне іх на рынак. У Магілёўскай вобласці такіх кластараў з'явіцца два — у сферы біятэхналогій на базе тэхнапарка ў Горках і Беларускай сельгасакадэміі. Другі — IT-кластар, каардынатарам яго стане Магілёўскае агенцтва рэгіянальнага развіцця. Гэты кластар аб'яднае Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій, якія размяшчаюцца на тэрыторыі вобласці, прадпрыемствы і спецыялізаваныя лабараторыі.

Плануецца рэалізаваць шмат амбіцыйных планаў па развіцці ўсіх галін народнай гаспадаркі. Напрыклад, на плошчах філіяла «Магілёўліфтмаша» — прадпрыемства «Электрарухавік» — плануецца стварыць высокатэхналагічную вытворчасць па выпуску электрарухавікоў для электратранспарту і пад'ёмна-транспартных механізмаў.

У праграму закладзены вялікі сацыяльны складальнік. З падрабязнасцямі гэтай часткі праграмы азнаёміла **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.** У прыярытэце — шчаслівая сям'я, у аснове якой традыцыйныя адносіны, здароўе, падтрымка маладых, клопат аб старэйшым пакаленні. Шмат увагі аддаецца шматдзетным сем'ям. Гэта і паляпшэнне іх жыллёвых умоў, пытанні працаўладкавання, павелічэнне дапамогі па доглядзе за малымі дзецьмі. У праграме запланавана будаўніцтва школ, дзіцячых садкоў. Так, за пяць наступных гадоў у Магілёўскай вобласці будзе ўзведзена 12 дзіцячых садкоў.

Са сваімі прапановамі выступілі і дэлегаты Усебеларускага народнага сходу. **Генеральны дырэктар «Магілёўхімвалакно» Пётр РУДНІК** прапанаваў зрабіць у вобласці яшчэ адзін кластар — хімічны. У Магілёве ёсць спецыяльныя навучальныя ўстановы, здольныя забяспечыць галіну кваліфікаванымі кадрамі, як з вышэйшай адукацыяй, так і з прафесійна-тэхнічнай.

Словы ўдзячнасці кіраўніцтву краіны выказаў **старшыня Слаўгарадскага райвыканкама Сяргей МІХАЛЮТА.** Праграма развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна, дзеянне якой распаўсюджваецца і на Слаўгарад, дапамагла раёну прыцягнуць да сябе ўвагу такіх буйных інвестараў, як бабруйскі «Чырвоны харчавік», Магілёўскі мясакамбінат. І планы на будучую пяцігодку тут вялікія.

— Вельмі добра, што сёлетні год прысвечаны адзінству ўсяго грамадства. Гэта добры пасыл на будучую пяцігодку, — падкрэсліў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.** — Калі народ адзіны, ён аднолькава падыходзіць да вырашэння праблем. Для Магілёўскай вобласці вельмі важна дасягнуць тых эканамічных паказчыкаў, якія забяспечылі б дабрабыт нашых людзей. Мы бачым нашы рэзервы ў прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, усе недахопы, якія ёсць. Усё гэта мы выкарыстаем як платформу для павышэння эфектыўнасці работы. Дакумент, што абмяркоўваўся сёння, людзі падтрымалі аднагалосна, паколькі бачаць, што гэта — наша будучае, перспектыва развіцця краіны.

— У мяне вялікае задавальненне ад Магілёва. Убачыўшы такую салідарнасць, я адчуў, што жыццё зменіцца, стане лепшым, — рэзюмаваў **кіраўнік адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЕЕНКА.** — У аснову ўсёй сацыяльнай палітыкі дзяржавы пакладзены інтарэс звычайнага чалавека. Гэта пытанні, якія датычацца адукацыі, аховы здароўя, развіцця інтэлектуальных магчымасцяў, даходаў. Падрыхтаваная праграма ўсёабдымная. Гэта сур'ёзны дакумент, у якім закладзены добрыя перспектывы для развіцця і Магілёўскай вобласці. Яны выклікаюць аптымізм. Дастаткова сказаць, што Магілёўшчына на працягу апошніх двух гадоў дэманструе поспехі і ў эканоміцы, і ў ахове здароўя, і ў стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы. Размова ішла аб захаванні чалавечых і гістарычных каштоўнасцяў, грамадства ў цэлым. Прыемна было бачыць, што ў зале сабраліся неабыякавыя людзі. Размова атрымалася вельмі канструктыўная. І кіраўнікі прадпрыемстваў, і педагогі, і простыя рабочыя выказалі сваю салідарнасць. Прагучалі і дзелавыя прапановы, якія патрабуюць рашэння на цэнтральным узроўні, і тыя, якія носяць рэгіянальны характар і будуць вырашацца на ўзроўні Магілёўскага аблвыканкама. Наогул мне спадабаліся канструктывізм, дзелавітасць і патрыятычнасць сходу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Клімат Беларусі

# НЕВЕРАГОДНА ЦЁПЛЫ ГОД

## А што далей?

**Прыйшоў час сіноптыкам падвodзіць вынікі. І, як прадчувалі, — мінулы год стаў самым цёплым за ўсю гісторыю метэаназіранняў у Беларусі (прыкладна з 1880 года). Сярэднегадавая тэмпература паветра ў 2020 годзе склала плюс 9,1 градуса, што на 2,4 градуса вышэй за норму. Гэты год пабіў рэкорд 2019-га (плюс 8,8 градуса ў сярэднім), які дагэтуль лічыўся самым цёплым.**

### Зімы як такой не было

Самыя свае анамальныя максімумы год стаў праяўляць ужо на старце халоднага сезона. Сярэдняя тэмпература мінулай зімы склала плюс 1,5 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 5,5 градуса. Як адзначыла **начальнік аддзела вывучэння змен клімату службы метэаралагічнага і кліматычнага маніторынгу і фонду даных Белгідрамета Наталля КЛЯВЕЦ**, такой цёплай зімы, як у снежні 2019-га, студзені і лютым 2020 года, на тэрыторыі Беларусі не адзначалася ні разу пачынаючы з 1881 года. Усе тры месяцы былі са станоўчымі сярэднямесячнымі тэмпературамі паветра. Самая высокая тэмпература адзначана ў Драгічыне 18 снежня, яна склала плюс 12,8 градуса, а мінімальная — на станцыі Азярышча 8 лютага — мінус 11,1 градуса.

Вясна мінулага года па сярэдняй тэмпературы была блізкая да кліматычнай нормы. А вось лета было цёплае, з сярэдняй тэмпературай паветра плюс 18,8 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 2,4 градуса, прычым жнівень быў значна цяплейшы, чым звычайна.

### Восень як спакойнае лета

Памятаеце леташнюю залатую восень? Так, амаль увесь верасень быў, лічыце, працягам лета. Сярэдняя тэмпература трох восеньскіх месяцаў 2020 года склала плюс 9,7 градуса, што на тры з лішнім градусы вышэй за норму. Такой цёплай восені на тэрыторыі краіны не адзначалася ні разу. Вернемся да верасня, ён стаў другім у гісторыі метэаназіранняў у Беларусі па плюсавай тэмпературы. Ды і кастрычнік быў анамальны — самы цёплы ў гісторыі метэаназіранняў у нашай краіне: плюс 10,5 градуса. Сярэдняя тэмпература лістапада — плюс 3,8 градуса, што на 3 градусы вышэй за норму. Так цёпла, як было ў лістападзе мінулага года, бывае ў нас нячаста — прыкладна раз у 9 гадоў.

Ды і заканчваўся год анамальным па цеплыні снежнем. Яго сярэдняя тэмпература (мінус 0,8 градуса) была вышэй за норму на 2,5 градуса. Такі снежань на тэрыторыі краіны адзначаецца раз у пяць гадоў.

Калі летась у зімовы сезон па цяпле ў нас быў відавочны перабор, то з дажджамі нам пашанцавала менш. У 2020 годзе метэаролагі адзначалі недабор ападкаў — іх выпала ўсяго толькі 92 працэнты ад нормы.

### Люты будзе снежны

Аб тым, як далёка зазіраюць беларускія сіноптыкі, расказаў **начальнік службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Аляксандр БЯГАНСКІ.** Так, у Белгідрамеце складаецца прагноз надвор'я максімум на шэсць дзён. І ў іх няма абсалютна дакладнай інфармацыі аб тым, якой будзе вясна ў гэтым годзе.

Што датычыцца апошняга зімовага месяца, то і ў лютым працягнецца зімовы характар надвор'я — гэта значыць з маразамі і снягамі. Хоць у апошнія гады люты быў хутчэй ужо вясновым месяцам.

Нашы сіноптыкі адзначаюць, што ў прынцыпе ніхто ў свеце не дае дэталёвых прагнозаў надвор'я з выкладкамі тэмператур, ападкаў, неспрыяльных з'яў на тэрмін больш чым 7-10 дзён.

Але ў інтэрнэце можна прачытаць прагнозы вядучых амерыканскіх ці еўрапейскіх цэнтраў. Якасць іх, на думку Аляксандра Бяганскага, вельмі невысокая, у чым мы маглі пераканацца летась: зіму 2019—2020 гадоў яны прагназавалі як самую халодную за апошнія 150 гадоў, а ў выніку яна аказалася самай цёплай.

Не будзем спяшацца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «Выконваючы ПДР — зберагаеш жыццё!»

**Пад такой назвай у апошнюю пятніцу месяца Дзяржаўтаінспекцыя правядзе Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху.**

Галоўнай тэмай выступленняў міліцыянераў стане прапаганда выканання ПДР усімі яго ўдзельнікамі. Супрацоўнікі ДАІ ў чарговы раз нагадаюць кіроўцам і пешаходам, да чаго прыводзяць недысцыплінаванасць і няўважлівасць на дарогах.

— Летась у сталіцы зарэгістравана 590 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 31 чалавек загінуў і звыш 600 атрымала траўмы рознай ступені цяжкасці. Па віне кіроўцаў транспартных сродкаў здарылася больш за 470 аварый. 79 ДТЗ дапушчаны па віне пешаходаў. Да асноўных прычын, якія прыводзяць да дарожных здарэнняў, варта аднесці невыкананне дзеючага заканадаўства. Статыстыка паказвае, што ў большасці выпадкаў кіроўцы і пешаходы трапілі ў ДТЗ не з-за слабага ведання Правіл дарожнага руху, а з-за сваёй недысцыплінаванасці, неасцярожнасці і непавагі адзін да аднаго, — распавяла **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе аддзела ДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.**

Самым распаўсюджаным відам ДТЗ па-ранейшаму застаецца наезд на пешаходаў. Толькі ў мінулым годзе ў Мінску з дадзенай катэгорыяй удзельнікаў дарожнага руху адбылося 243 аварыі (41 працэнт ад агульнай колькасці ДТЗ), у якіх загінула 17 чалавек. Акрамя таго, у ліку ўдзельнікаў дарожнага руху сустракаюцца кіроўцы, якія парушаюць правілы праезду скрыжаванняў, хуткаснага рэжыму і манеўравання. Нярэдка вінаватымі ў аварыях становяцца і нецвярозыя грамадзяне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Выдаткі на абарону павялічыліся да амаль двух трыльёнаў долараў



Летась сусветныя выдаткі на абарону выраслі на 1,9 працэнта. Агульны аб'ём выдаткаў склаў 1,93 трыльёна долараў. Аб гэтым паведаміла РБК са спасылкай на аналітыкаў агенцтва Janes, якое займаецца аналізам адкрытых даных па абароннай тэматыцы. У 2020 годзе найбольшы рост выдаткаў прадэманстравалі краіны Еўропы — адпаведныя расходы былі на 5,6 працэнтаў вышэй, чым годам раней. Па словах аналітыкаў, сёлета рост выдаткаў трохі замарудзіцца з-за наступстваў пандэміі COVID-19, але скарачэнне будзе абмежавана рэгіёнамі, якія залежаць ад экспарту сыравінных тавараў, і будзе ўраўнаважана павелічэннем у рэгіёнах, дзе ўсё яшчэ чакаецца ўстойлівы рост. У выніку агульны рост абаронных выдаткаў упадзе да рэкордна нізкага ўзроўню з 2013 года. «Найбольш моцны ўплыў пандэміі COVID-19 на фінансаванне, верагодна, будзе назірацца ў 2022 годзе, калі ўрады пачнуць абмяжоўваць выдаткі», — выказаў меркаванне вядучы аналітык Janes Эндру Макдональд.

### У Польшчы зафіксавалі рэкордны ўзровень смяротнасці

У Польшчы ў мінулым годзе зафіксаваны найвышэйшы ўзровень смяротнасці за перыяд з Другой сусветнай вайны, пры гэтым адзначаецца нізкая нараджальнасць, паведаміла газета Dziennik Gazeta Prawna са спасылкай на статыстычныя даныя. Паводле гэтых даных, у Польшчы, насельніцтва якой складае больш за 38 млн чалавек, у мінулым годзе памерла 486,2 тыс. Таксама летась зафіксавалі 357,4 тыс. нараджэнняў, што з'яўляецца самым нізкім паказчыкам з 2005 года. Такім чынам, насельніцтва Польшчы зменшылася на 129 тыс. чалавек у параўнанні з папярэднім годам. У 2019-м гэты паказчык склаў 36,4 тыс. Міністр па пытаннях сям'і і сацыяльнай палітыкі Марлена Малонг растлумачыла высокі ўзровень смяротнасці разгортваннем пандэміі каранавіруса. Яна падкрэсліла, што спатрэбіцца шмат часу, каб выправіць сітуацыю.

### Беспарадкі ў Ліване дапамагалі спыняць вайскоўцы



Вайскоўцы разам з паліцэйскімі спынялі беспарадкі, якія ўспыхнулі ў горадзе Трыпалі на поўначы краіны. У цэнтры горада акцыя пратэсту вылілася ў сутыкненні паміж дэманстрантамі і сіламі па падтрыманні грамадскага парадку. Салдаты і паліцэйскія ўжылі гумавыя кулі і гранаты са слёзатачывым газам для разгону вулічных маніфестантаў, якія закідвалі іх камянямі. Прычынай хваляванняў у Трыпалі — адным з найбяднейшых гарадоў Лівана — стала незадаволенасць насельніцтва з нагоды уведзеных уладамі абмежавальных мер у сувязі з ростам колькасці інфіцыраваных каранавірусам. Камендантская гадзіна, якая дзейнічае з 14 студзеня, на фоне фінансавага калапсу пагражае банкруцтвам малым і сярэднім прадпрыемствам. 21 студзеня Вышэйшы савет абароны падоўжыў надзвычайнае санітарнае становішча да 8 лютага.

Непагадзь

# Снежныя заносы, паваленыя дрэвы, затапленні

**У аўторак на тэрыторыі краіны назіраліся неспрыяльныя метэаралагічныя з'явы: дождж і снег, якія суправаджаюцца ветрам парывамі да 19 метраў у секунду.**

Паводле аператыўнай інфармацыі МНС, зафіксавана 80 выпадкаў падзення дрэў, у выніку чаго пашкоджаны 11 аўтамабіляў: у Гродзенскай вобласці — 56 выпадкаў, 9 аўтамабіляў; у Брэсцкай — 18 выпадкаў, 2 аўтамабілі; у Гомельскай і Мінскай — па 3 выпадкі. Пацярпелых няма. Работнікамі МНС і арганізацый праводзіліся работы па распілоўцы і прыманні дрэў, якія ўпалі.

Работнікамі МНС аказвалася дапамога ў вызваленні са снежных заносаў 75 аўтамабіляў: у Гродзенскай вобласці — 35, у Брэсцкай — 22, у Мінскай — 16, у Гомельскай і Магілёўскай — па адным аўтамабілі.

Паводле інфармацыі Беларускай чыгункі, з-за наліпання мокрага снегу на стрэлачных пераводах адбылася затрымка ў руху 13 цягнікоў (да 50 хвілін).

У Магілёўскай вобласці ў выніку дажджу і раставання снегу апынуліся падтопленыя пяць прыватных падворкаў у Асіповічах і дзесяць у вёсцы Таранава Магілёўскага раёна. Работнікамі МНС і арганізацый праводзіліся работы па адпампоўванні вады з падвалаў прыватных жылых дамоў. Адсяленне не патрабавалася.

Па даных «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна спынялася электразабеспячэнне 2198 населеных пунктаў (з іх 715 — у Гомельскай, 607 — у Брэсцкай, 444 — у Гродзенскай, 292 — у Мінскай, 116 — у Магілёўскай і 24 — у Віцебскай абласцях). Непаладкі аператыўна выпраўляліся аварыйнымі брыгадамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Крымінал, здарэнні

# Фіктыўна афарміла дачку пастухом

## А новага работніка пасяліла ў хляве

**Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі выявілі буйную аферу на сельгаспрадпрыемстве ў Талачынскім раёне. Пад падазрэннем — брыгадзір жывёлаводаў, якая фіктыўна афарміла сваю дачку пастухом і паўгода дадаткова атрымлівала зарплату падначаленага.**

Як паведамляе падрабязнасці гэтай гісторыі МУС, аператыўнікі высветлілі, што ў маі мінулага года 43-гадовая жыхарка Кобрынскага раёна прапанавала 53-гадоваму аднавяскоўцу работу жывёлаводам у сваёй брыгадзе. Паміж бакамі быў заключаны дагавор падраду, у якім фігуравала і 21-гадовая дачка жанчыны. Апошняя павінна была працаваць у пары з мужчынам, аднак фактычна ні разу не выйшла ў поле.

Па дамоўленасці брыгадзір пасяліла новага работніка ў хляве, мінімальна карміла яго, а зарплатную банкаўскую картку пакінула сабе. З яе жанчына рэгулярна здымала грошы і выдаткоўвала іх на ўласныя патрэбы. Незаконна наліченую зарплату дачкі сялянка таксама забірала сабе. У кастрычніку мужчына запатрабаваў ад знаёмай разлік. Нічога не атрымаўшы, ён звярнуўся па дапамогу да кіраўніцтва прадпрыемства, а затым і ў міліцыю. Высветлілася, што брыгадзір «зарабіла» больш за дзесяць тысяч рублёў. Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням жанчыны і распачалі крымінальную справу за махлярства, здзейсненае ў буйным памеры. Фігурантка раней прыцягвалася да крымінальнай адказнасці за крадзеж.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Дасталі з дваццаціметровага калодзежа

**У 16.18 з хутара Свабодка Воранаўскага раёна ў службу «101» паступіла паведамленне аб неабходнасці аказання дапамогі мясцоваму жыхару, які знаходзіцца ў калодзежы.**

Калі да месца выкліку прыбылі ратавальнікі, было ўстаноўлена, што на ўзроўні 20 метраў ад паверхні зямлі ў калодзежы з пітной вадой у прытомнасці знаходзіцца мужчына. Як паведамляе МНС, высветлілася, што ў працэсе чысткі студні мясцовы жыхар 1963 года нараджэння адчуў недамаганне і самастойна выбрацца не мог. Яго прыяцель патэлефанаваў ратавальнікам. Работнікі МНС пры дапамозе вяроўкі, лябёдкі і страхавальнай прылады за некалькі хвілін паднялі пацярпелага на паверхню і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Шпіталізацыя выратаванаму не спатрэбілася.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Драйверы росту Гродзеншчыны

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па выніках работы за мінулую пяцігодку рэгіён дасягнуў станоўчай дынамікі па большасці паказчыкаў, якія прадугледжаны праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця. Прамысловасць за мінулыя пяць гадоў прырасла на 13 %, сельская гаспадарка — на 14 %, валавы рэгіянальны прадукт павялічыўся на 5 %.

Мэта новай пяцігодкі — забяспечыць сацыяльную стабільнасць у грамадстве і дабрабыт грамадзян. Таму і эканоміка Гродзеншчыны на новую пяцігодку захавае сацыяльную скіраванасць. У бюджэце вобласці толькі сёлета амаль 68 % расходаў запланавана на сацыяльную сферу.

Як вядома, 2021-ы дае старт і новаму інвестыцыйнаму цыклу. На пяцігодку ў вобласці ставіцца задача рэалізаваць амаль 200 інвестпраектаў, большасць з якіх — вытворчыя.

— Сёлета рэгіёну прыйдзецца вырашаць задачы, скіраваныя на рост эканомікі, запуск новага інвестыцыйнага цыкла. Прадугледжана павелічэнне інвестыцый у асноўны капітал да 3,6 млрд рублёў. Першы год пяцігодкі пачынае фарміраваць базу, ад якой залежыць далейшы поспех. Пры гэтым арыенцір робіцца не на колькасць, а на якасць паказчыкаў, — зазначыў суразмоўнік.

Стаўка — на выпуск інавацыйнай, запатрабаванай прадукцыі, укараненне новых тэхналогій, стварэнне новых вытворчасцяў, якія павінны забяспечыць стабільны рух новага інвестыцыйнага цыкла. У яго аснове — 2-3 буйныя аб'екты па вобласці і, як мінімум, па адным праекце на раён. І ў рэгіёнаў на перспектыву ёсць такія праекты. Так, на 2021—2025 гады запланавана будаўніцтва новага азотнага комплексу «Гродна Азот», будаўніцтва завода па вытворчасці шкляной тары з выкарыстаннем інавацыйнай энергаэфектыўнай тэхналогіі Гродзенскім шклозаводам. Пачалося будаўніцтва дрэваапрацоўчага прадпрыемства ў Свіслацкім раёне, працягваецца развіццё дрэваапрацоўчага прадпрыемства ў Смаргонскім раёне.


На прадпрыемстве «Малочны мір».

У гэтым кірунку мяркуецца задзейнічаць усе рэгіёны вобласці. Галоўная ўвага будзе аддавацца Лідскаму раёну, дзе прадугледжана паскоранае развіццё. У Лідзе, напрыклад, плануецца стварыць вытворчасць па выпуску нестэрыльных лекавых сродкаў, прадпрыемства па гарачым ацынкаванні дробных вырабаў і іншыя праекты. Ёсць свае праекты і ў іншых раёнах. Гэта дазволіць пераразмеркаваць працоўныя рэсурсы.

Па словах Віталя Нявера, асноўны прырост эканомікі плануецца атрымаць за кошт прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю і транспартных паслуг. Гродзеншчына даволі моцны сельскагаспадарчы рэгіён, тут вырабляецца 19 % харчовай прадукцыі краіны. Вось і на пяцігодку вобласць мяркуе нарошчваць свой патэнцыял у сельскагаспадарчай галіне. У першую чаргу, павысіць канкурэнтаздольнасць сельгаспрадпрыемстваў. Між тым укладзеныя дзяржавай інвестыцыі павінны працаваць і даваць аддачу. На пяцігодку стаіць задача забяспечыць рост валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі на 14 %, а ўзровень продажаў павялічыць да 2025 года не менш як на 10 %. І для такіх амбіцыйных планаў ёсць пэўныя падставы.

— На галіну традыцыйна робіцца высокія стаўкі. Таму і ў стартавы год пяцігодкі найважнейшай задачай развіцця сельскай гаспадаркі з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, што дазволіць атрымаць больш прадукцыі як у раслінаводстве, так і жывёлагадоўлі, — зазначыў Віталь Нявера. — Мінулы год быў даволі паспяховы для аграрнага сектара эканомікі, парадаваў добрым ураджаем. Сёлета стаіць задача дасягнуць ураджайнасці збожжавых не ніжэй за 45 ц/га. Плануецца павялічыць вытворчасць цукровых буракоў амаль на 17 %, павялічыць аб'ёмы нарыхтоўкі кармоў, бульбы, садавіны і агародніны. У жывёлагадоўлі плануецца павялічыць на 200 кг надой на карову, што складзе 6,3 тысячы кілаграмаў, а гэта на 8 % вышэй чым летась.

Добрыя стартавыя ўмовы для паскоранага развіцця мае перапрацоўчая галіна. Укараненне сучасных рэцэптур і тэхналогій, пашырэнне асартыменту прадукцыі, выпуск прадукцыі з больш працяглымі тэрмінамі захоўвання сталі магчымы, дзякуючы своечасовай мадэрнізацыі малочных і кансервавых заводаў, мясакамбінатаў. Гэта значна павялічыла экспартны патэнцыял галіны. На сённяшні дзень рэгіён пастаўляе на замежны рынак каля 30 % мясной і 70 % малочнай прадукцыі.

На перспектыву ў рэгіёне мяркуюць знізіць пастаўкі сыравіны, а экспартаваць гатовы прадукт з высокай дабаўленай вартасцю і маржынальнасцю. Гэта будзе дасягацца шляхам глыбокай перапрацоўкі з паступовым памяншэннем экспарту сыравіны. З такой мэтай у найбліжэйшы час будзе распрацавана канцэпцыя развіцця перапрацоўчай галіны з планамі па росце вытворчасці АПК. Дарэчы, такая задача стаіць і перад дрэваапрацоўчай галіной.

Важным драйверам росту эканомікі і разам з тым дабрабыту насельніцтва павінна стаць будаўніцтва жылля, якога плануецца ўвесці 420 тысяч квадратных метраў, з іх 145 тысяч — гэта індывідуальнае жыллё. Сфера будаўніцтва, у тым ліку інвестыцыйны складнік, будзе адлюстроўваць сацыяльную скіраванасць дзяржавы: 110 тысяч «квадратаў» мяркуецца ўвесці з дзяржпадтрымкай. Гэта значыць, што больш за 1160 шматдзетных сем'яў змогуць у хуткім часе справіць наваселле.

— Зараз Гродзенскі рэгіён — лідар у краіне па будаўніцтве жылля. На найбліжэйшыя гады запланавана ўзвядзенне дзясятка новых аб'ектаў сацыяльнай сферы, адукацыі, медыцыны. Большасць новабудоўляў будзе ўзведзена за кошт абласной інвестыцыйнай праграмы. Напрыклад, у мікрараёне Грандзічы абласнога цэнтра сёлета будзе адкрыты дзіцячы садок на 230 месцаў з басейнам. Падобныя ўстановы з'явяцца ў Скідзелі, Лідзе, Слоніме. Вядзецца рэканструкцыя гарадской клінічнай бальніцы № 4 пад установу КТ і МРТ, — заўважыў Віталь Нявера.

Але гэта, вядома, толькі частка новых аб'ектаў сацыяльнай сферы. Працягнецца будаўніцтва анкадыспансера, які стане па-сучаснаму абсталяваннай медыцынскай установай. Пачынаецца праектаванне новай 2-й бальніцы ў Гродне, у раёнах прадоўжыцца мадэрнізацыя медыцынскіх аб'ектаў пад установку сучаснага дыягнастычнага абсталявання. Працягнецца будаўніцтва дзіцячых садкоў, рэканструкцыя школ. Значныя сродкі будуць накіраваны на будаўніцтва дарог, працягнецца ўзвядзенне моста ў Гродне, які неабходны для транспартнай інфраструктуры горада.


Будуецца жылы мікрараён Грандзічы ў Гродне.

Далейшае развіццё атрымаюць такія перспектыўныя сектары эканомікі, як лагістыка і турызм. А між тым рэгіён знаходзіцца на стыку двух буйных аб'яднанняў — ЕС і ЕАЭС. На тэрыторыі вобласці пралягае некалькі транзітных калідораў, сем міжнародных пунктаў пропуску, праз якія штогод праходзіць каля 1 мільёна аўтамабіляў. Таму яшчэ адным кірункам работы рэгіёна стануць мадэрнізацыя транспартнай інфраструктуры і развіццё лагістыкі.

Яшчэ адна перспектыўная сфера — турызм. У вобласці багатая гісторыка-культурная спадчына. А турызм у структуры ВРП складае толькі 3 %, а гэта недастаткова. Тут варта больш поўна інфармаваць аб турыстычнай прывабнасці, забяспечыць якасны пакет паслуг для турыстаў. І тут ёсць над чым працаваць.

Ключавая задача — забяспечыць стабільны рост заработнай платы. За пяцігодку мяркуецца павялічыць рост зарплаты ў паўтара раза. Прыярытэтнай задачай мясцовых улад стане павелічэнне даходаў мясцовых бюджэтаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з сайта grodnonews.**




Слова — дэлегатам

## «Каб захаваць краіну, нам трэба не страціць сваіх дзяцей»

Царква — гэта духоўная лякарня, куды прыходзяць людзі з усімі сваімі хваробамі, як душэўнымі, так і цялеснымі. Як сказала **настаяцельніца Свята-Раство-Багародзічнага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра ў Гродне, ігумення Гаўрыіла,** у Дом Божы чалавек ідзе, каб ачысціць сваю душу і папрасіць у Бога ўнутранага міру для сябе і ў адносінах з блізкімі.



Глава Царквы — Хрыстос, і яна з'яўляецца Домам Божым на зямлі, куды можа прыйсці любы чалавек. Усіх запрашае Гасподзь у свой Дом. Прадстаўнікі царквы не павінны без дабраславення Свяшчэннаначалля ўдзельнічаць у якіх-небудзь палітычных акцыях і мерапрыемствах.

— Галоўны ўдзел для ўсіх нас, — распавядае ігумення, — праваслаўных вернікаў, — гэта ўдзел у малітве, як у саборнай, так і ў дамашняй, у здзяйсненні добрых спраў, скіраваных на выратаванне душы і на карысць блізкім.

Аднак, з'яўляючыся хрысціянкай і будучы манашкай, матушка Гаўрыіла лічыць сябе і грамадзянкай зямной Айчыны.

— Родам я з Саратава, які знаходзіцца на беразе вялікай рускай ракі Волгі, — адзначае ігумення Гаўрыіла, — але маю і беларускія карані. Мой дзядуля нарадзіўся ў Гродне ў 1900 годзе, ды і сама я заканчвала сярэднюю школу ў Жыровіцах Гродзенскай вобласці. З 1992 года жыву ў Гродне і да сённяшняга дня нясу послух настаяцельніцы Раство-Багародзічнага манастыра. Таму калі Гасподзь дабраславіў мне тут папрацаваць, то я абавязана разам з іншымі насельніцамі памятаць пра тое, што хоць мы сышлі са свету грахоўнага, са свету запалу і спакус у манастыр ратаваць свае душы і маліцца за ўсіх, але ў той жа час мы застаёмся грамадзянамі нашай роднай Беларусі.

На VI Усебеларускім народным сходзе настаяцельніца Свята-Раство-Багародзічнага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра з'яўляецца дэлегатам ад Беларускага саюза жанчын. Яна ўдзельнічала і ў I Усебеларускім сходзе.

Дарэчы, Беларуская праваслаўная царква ў асобе мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, ужо ўнесла свае пажаданні, якія могуць быць улічаны пры стварэнні паправак да новай Канстытуцыі.

У прыватнасці, ігумення Гаўрыіла звяртае ўвагу на два галоўныя пытанні — духоўнае выхаванне моладзі і ўмацаванне інстытута традыцыйнай сям'і.

— З моладдзю неабходна працаваць больш актыўна, — мяркуе настаяцельніца Гродзенскага манастыра. — Наша славянская моладзь асаблівая, таленавітая, яна шукае, імкнецца да навук. Моладзь — гэта не толькі наша будучыня, але і сучаснасць. Каб захаваць краіну, нам трэба не страціць сваіх дзяцей.

Важнымі застаюцца рэальныя стасункі бацькоў з дзецьмі, якога б узросту яны ні былі. З-за смартфонаў і іншых гаджэтаў матчына слова і ласка сыходзяць на другі план, але толькі праз непасрэдныя, асабістыя гутаркі, суперажыванне і ўдзел у жыцці дзіцяці яно зможа зразумець, што ў свеце правільна і рэальна, што ёсць добра, а што ёсць зло.

— Дзіця павінна наяве бачыць коціка або сабачку, елачку ці бярозку. Яму неабходна ў рэальнасці дакранацца да рэчаў, а не праз смартфоны або планшэты. Цяпер дзеці лепш за бацькоў засвойваюць камп'ютарныя тэхналогіі, але празмерна гэтым захапляючыся, пачынаюць ісці да раскладання духоўных, маральных і эстэтычных каштоўнасцяў.

Царква выказвае заклапочанасць узроўнем паглыбленасці людзей у сацыяльных сетках. Таму прапануецца вярнуць урокі маралі і духоўнасці, каб дзеці не забывалі сваіх каранёў, а таксама каб шанавалі бацькоў, выконваючы 5-ю запаведзь Божую, і аддана любілі Радзіму, каб стаць яе дастойнымі грамадзянамі.

— Інстытут сям'і і мацярынства таксама патрабуе ўмацавання і ўдасканалення, — кажа матушка Гаўрыіла. — Неабходна, каб была нармальная традыцыйная сям'я, дзе няма месца падзелу бацькоў на «№ 1» і «№ 2». Гэта ненармальная з'ява, антыхрысціянская, антыгуманная. Галоўным і першым словам для дзіцяці было, ёсць і павінна заставацца «МАМА».

Такім чынам, праваслаўная царква заўсёды клапоціцца пра будучыню нашай дзяржавы. Сучаснае грамадства жыве не толькі «для сябе» і сённяшнім днём, але абавязана клапаціцца пра будучыя пакаленні. Як для нас нашы продкі захавалі краіну, так і мы павінны не толькі захаваць і не разбурыць яе, але і прымножыць ранейшыя дасягненні, поспехі і набыткі.

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
28 СТУДЗЕНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 2 (15901)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Вадзім МЕЗГА:

# «БОКС ЗАМЯНІЎ НА ПЕСНІ»



Спорт і творчасць у Вадзіма заўсёды ідуць побач.

Фота Міхаіла МАРУГІ.

**У дзяцінстве наш герой марыў займацца і спортам, і музыкай адначасова. Здаецца, што гэта немагчыма, аднак яму ўдалося ажыццявіць свае мары. Сёння ён з'яўляецца першым уладальнікам алімпійскай ліцэнзіі Беларусі па боксе, майстрам спорту СССР, майстрам спорту міжнароднага класа і прызёрам чэмпіянатаў свету і Еўропы, а яго прыгожыя песні пра знаёмыя кожнаму чалавеку пачуцці часта гучаць на канцэртах, радыё і тэлебачанні. Як рынг і сцэна сталі яго лёсам, а таксама пра новыя захапленні і, канешне, творчасць пагаворым у гасцёўні «Чырвонкі. Чырвонай змены» з Вадзімам МЕЗГОЙ.**

Калі мы сустрэліся, першае пытанне, якое задаў мне Вадзім, было пра тое, ці падобны ён на баксёра. Прызнацца шчыра, гэта крыху збянтэжыла, бо да інтэрв'ю я падрыхтавалася і ўжо ведала, што ў мінулым мой суразмоўнік — менавіта баксёр. Аказваецца, звычайна яго асацыююць з гімнастам ці плыўцом. З такой лёгкай разрадкі і пачалася наша размова...

— Я магу накіроўваць маладых спартсменаў, падказваць, выкладаць ім. Калі ў мяне здараюцца выезды за мяжу па артыстычнай дзейнасці (напрыклад, перад пандэміяй ездзіў ва Украіну), стараюся паралельна працаваць з імі ў кантэксце майстар-класаў. Хоць вялікі спорт даўно за плячыма, аднак, як той казаў, былых спартсменаў не бывае, і таму нядаўнім маім захапленнем стаў вялікі тэніс: асвойваю яго сямімільнымі крокамі, трэніруюся дзесьці па тры-чатыры разы на тыдзень. Мне вельмі падабаецца, мы гуляем у парах і ў Мінску, і ў маім родным Магілёве. Таксама актыўна хаджу на валейбол — як мінімум дзве трэніроўкі на тыдзень. А бокс заўсёды побач, бо гэта такі від спорту, што калі ты ўжо быў у ім, — падмурак закладзены, і не можаш па-іншаму — не ўяўляеш сябе без яго. Усё ж такі я ўваходзіў у маладзёжную зборную СССР! Часта прыгадваю, як з першым трэнерам Аляксандрам Катляровым, брыгадай трэнераў — Сямёнам Соркіным, Мікалаем Дземянковым, Міхаілам Кісялёвым — абаранялі нашу краіну, як мне ўдалося стаць першым уладальнікам алімпійскай ліцэнзіі па боксе ў суверэннай Беларусі. Гэта было першае кваліфікацыйнае адборачнае спаборніцтва, якое праходзіла ў Даніі на чэмпіянаце Еўропы ў далёкім 1995 годзе. Калі разыгрываліся ліцэнзіі, па баях атрымлівалася, што мая першая сярэдняя вага — 67 кілаграмаў (пасля 2000 года Сусветная асацыяцыя бокса змяніла гэты нарматыў на 69 кілаграмаў), — якая звычайна «насычана» спартсменамі, па жараб'ёўцы выпала на паядынак. Я выйграў яго і такім чынам атрымаў права выступаць на Алімпійскіх гульнях у Атланце.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Лакацыі актыўнасці

# «ПРЫБЯРОМ СНЕГ РАЗАМ»

**Чэлендж пад такой назвай запусціла гродзенская моладзь. Акцыя была ініцыяваная абласным камітэтам Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.**

У ходзе чэленджа валанцёры прапануюць пасільную дапамогу ў расчыстцы тэрыторыі ад снегу сацыяльным установам, установам аховы здароўя, камунальным службам. У першую чаргу валанцёры гатовыя прыйсці на дапамогу ўстановам аховы здароўя, чые сілы сёння накіраваны на барацьбу з COVID-19. Калі дапамога спатрэбіцца, напрыклад, у ачышчэнні ад снегу тэрыторыі дзіцячага садка ці школы, валанцёры таксама дапамогуць. Без увагі і дапамогі яны не пакінуць і адзінокіх пажылых грамадзян. Таксама чэлендж «Прыбяром снег разам», які працягнецца да заканчэння зімовага перыяду, будзе скіраваны на прыборку снегу з двароў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, вязняў фашысцкай акупацыі, інвалідаў.



Фота з сайта БРСМ.

Неўзабаве да акцыі далучылася моладзь астатніх абласцей і сталіцы, прыняўшы эстафету ад гродзенцаў. Заяўку на аказанне дапамогі можна пакінуць па тэлефонах маладзёжных «гарачых ліній», якія працуюць на базе ўсіх тэрытарыяльных камітэтаў БРСМ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Рух ад сэрца

# «ВАЛАНЦЁРСТВА НАТХНЯЕ!»

**Дзевятнаццацігадовая Анастасія ГАНЧАРОВА — навучэнка чацвёртага курса Сацыяльна-гуманітарнага каледжа Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова па спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя». Значную частку яе жыцця займае валанцёрская дзейнасць. Летась дзяўчына стала адной з пераможцаў у рэспубліканскім конкурсе «Валанцёр года — 2020» у намінацыі «Асабісты ўклад» сярод навучэнцаў устаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі.**



— У валанцёрскую дзейнасць паглыбілася на першым курсе вучобы чатыры гады таму, хоць з дзяцінства таксама была схільная да добрых спраў: усіх шкадавала, заўсёды заступалася за слабых, дапамагала бадзяжным жывёлам. У нас у каледжы вельмі моцна развіты гэты рух, ёсць аб'яднанне па інтарэсах «Валанцёрства», з якога для мяне ўсё і пачалося. Дабрачыннасць бывае розная, я займаюся сацыяльнай: клапачуся пра дзяцей, працую з тымі, хто ўваходзіць у пэўную сацыяльна неабароненую катэгорыю, а таксама культурнай — арганізоўваю розныя паездкі, мерапрыемствы. Я па жыцці актыўная, мэтанакіраваная, ініцыятыўная, таму займацца гэтым мне лёгка, атрымліваю вялікае задавальненне.

Анастасія супрацоўнічае з многімі арганізацыямі: Чырвоным Крыжам, Беларускім дзіцячым фондам, ЮНІСЕФ, БРСМ.

— Разам з іншымі хлопцамі і дзяўчатамі наведваем дзіцячыя садкі, дзіцячую псіхіятрычную бальніцу, іншыя сацыяльныя ўстановы з клоўнатэрапіяй, колератэрапіяй, дабрачыннымі акцыямі і праграмамі, прывозім падарункі. Самым адказным і значным для мяне стаў міжнародны пілотны праект «#ДАВАЙДРУЖЫЦЬ», скіраваны на падтрымку дзяцей з цяжкімі захворваннямі, інваліднасцю, а таксама іх сем'яў. Ён дазволіў зразумець многія рэчы. Гэтыя дзеці пераважна знаходзяцца дома і абмежаваныя ў кантактах са сваімі аднагодкамі, ім складана з кімсьці пасябраваць.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
28 01 2021 г.

# МАТЫВАЦЫЯ ПРАЗ ГЕЙМІФІКАЦЫЮ,

## або Як працуюць механізмы гульні ў адукацыі

**Вядома, што гульня здольная захапіць усю ўвагу чалавека і не адпускаць яе доўгі час. Паводле сусветнай статыстыкі, не адмаўляе сабе ў такім баўленні часу каля 60 працэнтаў людзей. Прычым гэтая «слабасць» уласцівая не толькі падлеткам, як хтосьці памылкова мог падумаць. Сярэдні ўзрост гульца ў Еўропе і Паўднёвай Амерыцы (калі казаць пра электронныя гульні) — 35 гадоў, а сярэдні час знаходжання ў гульні складае адну гадзіну. Каму і як прыйшла ідэя выкарыстоўваць гульнявыя механізмы за межамі гульнявой індустрыі, сёння ніхто ўжо не прыгадае. Хутчэй за ўсё, гэта адбылося адначасова ў розных краінах і ў розных сферах. А пазней узнік і тэрмін — «гейміфікацыя».**

### Інтэрактыўнае навучанне

— Гульня дапамагае зменшыць разрыў паміж тым, што чалавеку трэба рабіць, і тым, што яму падабаецца, — разважае **кансультант па пытаннях інвестыцый у сацыяльную сферу Павел ФУНЦІКАЎ.** — Гейміфікацыя — гэта выкарыстанне розных гульнявых элементаў для павелічэння цікавасці, узмацнення ўцягнутасці і лаяльнасці. Як гэта адбываецца на практыцы? Напрыклад, у Стакгольме, каб зменшыць хуткасць на праблемным участку дарогі, запусцілі латарэю. Калі ты не перавышаеш устаноўлены паказчык, то можаш у ёй удзельнічаць: за дзеяннямі кіроўцаў сачылі мабільныя камеры, а прызавы фонд складаўся са штрафаў, якія выплачвалі парушальнікі хуткаснага рэжыму. Дык вось, пры абмежаванні ў 30 кіламетраў у гадзіну сярэдняя хуткасць складала там 32 кіламетры, а пасля запуску праекта яна зменшылася да 25. Ідэя з латарэяй спрацавала добра. Гейміфікацыя сёння паспяхова выкарыстоўваецца ў бізнесе, гандлі, сацыяльнай сферы, ахове здароўя і, безумоўна, у адукацыі. Гульні павышаюць матывацыю ў любой сферы. Да таго ж менавіта пры дапамозе гульні ўсе мы ў дзяцінстве засвойвалі пэўныя навыкі.

Гейміфікацыя адукацыі — натуральны этап развіцця, звязаны з укараненнем тэхналогій у звычайнае жыццё і актывізацыяй пакалення, якое разумее гульню і добра адгукаецца на яе механізмы. Але не варта блытаць яе з гульнёй: гейміфікацыя робіць працэс навучання інтэрактыўным, але скіравана яна перш за ўсё на дасягненне выніку.

Гульні ў адукацыі былі заўсёды: настольныя, дзелавыя, ролевыя... Аднак цяпер лічбавыя магчымасці зрабілі іх больш цікавымі і прадукцыйнымі з пункту гледжання адукацыйнага эфекту. Іх можна выкарыстоўваць у якасці сімулятараў, для мадэлявання, прагназавання. Да заняткаў можна падключыць дзяцей з іншага пункта зямнога шара.

### Захапі мяне

— Сёння мы вымушаны лічыцца з новымі адукацыйнымі трэндамі, — падкрэслівае **Андрэй ЛАГІНОЎСКІ, сузаснавальнік школы робататэхнікі і праграмавання Thinklum у Сіднеі,** адзін з удзельнікаў канферэнцыі «Гейміфікацыя ў адукацыі».

Адзін з апошніх адукацыйных трэндаў — гэта пераход навучання ў анлайн: COVID-19 прымусіў усіх педагогаў працаваць над павышэннем узроўню сваёй тэхнічнай падрыхтаванасці і асвойваць новыя інструменты. Другі — навучанне ў VR/AR. Тыя ж хімічныя эксперыменты ў віртуальнай рэальнасці абсалютна бяспечныя, нават калі ўвагу настаўніка хтосьці адцягнуў. Гэта тэхналогія яшчэ развіваецца, і ў яе ёсць пэўныя абмежаванні, напрыклад, па часе знаходжання ў віртуале. Педагогам давядзецца лічыцца і са штучным інтэлектам: настаўнікі-робаты ўжо з'явіліся. Педагог не можа ўсё ведаць і яму патрабуецца пэўны час, каб знайсці патрэбную інфармацыю. А робат можа «выдаць» яе за лічаныя секунды, і дзеці да гэтага хутка прывыкаюць. Таму роля выкладчыкаў усё больш будзе ахопліваць іншыя аспекты, напрыклад дапамогу ў асэнсаванні і апрацоўцы інфармацыі. Працэс ператварэння іх у ментараў будзе прагрэсіраваць. А вось гейміфікацыя ўжо цяпер выкарыстоўваецца вельмі шырока. Лідарамі ў яе ўкараненні з'яўляюцца Аўстралія, Паўднёвая Карэя, Японія, Сінгапур, Кітай.

Вы можаце спытаць, а навошта нам гульні ў адукацыі? «Кітайская мудрасць сцвярджае: «Скажы мне, і я забуду, пакажы мне, і я запомню, захапі мяне, і я зразумею». Гейміфікацыя неабходная, каб мы прасцей запаміналі новую інфармацыю», — тлумачыць Андрэй Лагіноўскі.

### Палігон для эксперыментаў

Увогуле, паспяховае навучанне ўяўляе з сябе спалучэнне трох элементаў: на дзесяць працэнтаў яно складаецца з вывучэння тэорыі, 20 працэнтаў — гэта зваротная сувязь і назіранне за прафесіяналамі, а 70 працэнтаў — практычны вопыт. Гейміфікацыя якраз і робіць упор на практыку.

— Калі вы запытаецеся ў дзяцей «Што такое для цябе работа?», яны адкажуць: «Школа і дамашнія заданні». А калі запытаецеся «А што такое для цябе гульня?», то многія скажуць: «Камп'ютарныя гульні». Дык што мы, педагогі, можам зрабіць, каб захапіць дзяцей? Каб яны не ўспрымалі вучобу як цяжкі абавязак? Трэба пераўтварыць працэс навучання ў гульню, — кажа Андрэй Лагіноўскі. — Якія ў камп'ютарнай гульні асноўныя характарыстыкі? Наратыўнасць (прысутнічае нейкая гісторыя), неадкладная зваротная сувязь (вы адразу разумееце, дзе памыліліся) і радасць. Падчас навучання вы адчуваеце не нуду, а задавальненне. А паралельна атрымліваеце і актуальныя навыкі. Гейміфікацыя дапамагае стварыць бяспечнае асяроддзе для іх адпрацоўкі, таму што адсутнічае страх перад здзяйсненнем памылкі. Гульнявыя вынікі — поспехі і няўдачы ў роўнай ступені — дазваляюць дзіцяці патрэніравацца ў ацэнцы ўласных дзеянняў, пераглядзе стратэгій і тактык паводзін, выяўленні сваіх моцных і слабых бакоў. Менавіта ў гульнях дзеці знаходзяць палігон для бясконцых эксперыментаў. Ведаючы, што ніякае паражэнне не можа быць канчатковым, падлетак смела спрабуе новае.

Паражэнне ад рукі камп'ютарнага саперніка становіцца падставай задаць сабе самыя важныя пытанні: «Што я зрабіў не так?», «Дзе ў мае планы закралася памылка?», «Ці правільна я ацаніў сітуацыю?» і «Як мне змяніць сваё паводзіны, каб дамагчыся поспеху?» Гульня ніколі не скажа гульцу: «Сядай, два» — пасля такога «прысуду» ні пра якія эксперыменты гаворкі ісці ўжо, вядома, не магло б. Асноўнае адрозненне гейміфікацыі ад стандартнага навучання — гэта стаўленне да памылак. Усе ведаюць выраз «вучыцца на сваіх



памылках»... Для камп'ютарных гульняў гэта галоўны прынцып. Нічога страшнага ў няўдачах няма. Ты памыляешся, выпраўляеш сваю памылку і рухаешся далей.

Кожная гульня ўтрымлівае мноства выпрабаванняў, складанасць якіх паступова расце. У навучальнай гульні таксама павінна быць шмат узроўняў, інакш будзе нецікава. Матывавальным фактарам з'яўляюцца своеасаблівыя індыкатары прагрэсу ці росту, напрыклад балы, значкі, карткі, бэйджы, дошка лідараў і гэтак далей.

— У сваёй школе мы даўно пераканаліся, што ў гульнявой форме дзеці здольныя запомніць нашмат больш інфармацыі, — канстатуе Андрэй Лагіноўскі. — З дапамогай гульні можна вучыцца праграмаванню, матэматыцы, фізіцы, біялогіі і геаграфіі. Напрыклад, у гульні «Місія на Марс» нашы выхаванцы спачатку праходзяць квэст на Зямлі, вырашаюць пэўныя задачы, дзе патрабуюцца веды з самых розных абласцей, і толькі потым, атрымаўшы патрэбныя каардынаты, накіроўваюцца ў касмічнае падарожжа. Яны забываюць аб працэсе навучання і захоплена рухаюцца да мэты. Табліцу хімічных элементаў мы таксама вывучаем у гульні. Псіхалагічнае напружанне знікае, і нават самыя замкнёныя дзеці праяўляюць актыўнасць, раскрываюцца з нечаканага боку.

Вельмі моцны інструмент — стварэнне ўласнай гульні. Калі нашы вучні ствараюць уласныя гульні, яны размяркоўваюць у камандзе ролі, а гэта моцная сацыялізацыя: так дзеці вучацца цаніць і паважаць усіх, разумеюць, што ў агульнай сістэме свой уклад уносіць кожны.

### Школьны «серыял»

Педагогі, у якіх ужо ёсць вопыт укаранення гейміфікацыі ў навучальны працэс, з упэўненасцю кажуць, што нават смецце дзеці будуць збіраць з азартам, калі ператварыць яго ў рэсурс для перамогі.

Школьны настаўнік Дэвід Хантэр з Сіэтла распрацаваў цэлую сістэму навучання, заснаваную на гульнявым сцэнарыі. Яго курс — гэта квэст па постапакаліптычным свеце, населеным зомбі, а контурныя карты і падручнік — гэта комікс. Задача дзяцей — праклічыць бяспечны маршрут, пакінуць эпіцэнтр збору зомбі, не стаць іх здабычай і стварыць чалавечую калонію. Поспех кожнай «місіі» залежыць ад таго, наколькі добра школьнікі праходзяць тэсты па відах глебы, міграцыі, відах рэльефу, клімату і іншых геаграфічных раздзелах. Кожнае заданне, паводле канонаў гейміфікацыі, вядзе на новы ўзровень і набліжае да мэты. Дзеці паглыбляюцца ў працэс і ўжо не адчуваюць сябе заложнікамі сітуацыі, бо навучанне — гэта насамрэч цікава! А калі цікава, то ўсе веды засвойваюцца нашмат лепш, дзякуючы пазітыўным эмоцыям.

Можна адправіць вучняў у «экспедыцыю» па кантыненце, краіне, свеце інфармацыі і гэтак далей, каб павандраваць і выканаць пэўныя заданні, а ў выніку — нешта вывучыць. Для ўзмацнення станоўчага эфекту можна арганізаваць не толькі індывідуальнае, але і групавое падарожжа: у мікрагрупах, парамі ці ўсім класам. Можна выкарыстоўваць такую ідэю для рэалізацыі міжпрадметных сувязяў: у «падарожжы» па адным прадмеце могуць спатрэбіцца веды і ўменні з іншых.

Згадайце, як трымае нас у напружанні элемент адваротнага адліку ў якім-небудзь фільме: ці паспее герой абясшкодзіць бомбу і выратаваць свет? У навучальным курсе гэтая ж ідэя дадае шмат драмы і... весялосці працэсу. Можа быць, да нас ляціць метэор і мы павінны адхіліць яго? А можа, злы доктар рыхтуе канец свету, і таго трэба высачыць?.. Кожны занятак можна разбіць на «серыі».

### За добрыя справы

**Наталля ІСКАРЦАВА, дырэктар і сузаснавальніца школы «Стэмбрыдж»,** расказала, як падгледзела ў адной з амерыканскіх школ цікавую ідэю з «прэйскурантам» і карткамі заахвочвання. На апошніх было напісана, каму, кім і за што яны выдадзены. Пэўная колькасць такіх картак дазваляла «купіць», напрыклад, «камп'ютарны» час або абед з дырэктарам.

— Цяпер такія «плюшкі» за добрыя справы можна атрымаць і ў нашай школе. У наш «прэйскурант» уваходзіць, напрыклад, права правесці ўрок у малодшых класах, два тыдні абслугоўвання ў сталовай без чаргі, персанальная піца ў школу. Канешне, ёсць канцтавары з лагатыпам школы, кубачак, сумка, футболка, бейсболка з вышытым лагатыпам. Самае «дарагое» заахвочванне — крутая байка з лагатыпам: каб яе атрымаць, трэба набраць 26 бірузовых картак. Пакуль што яна яшчэ чакае свайго гаспадара, — усміхаецца Наталля. — Калі з'явіліся бірузовыя карткі, мы заўважылі, як у дзяцей абудзіўся прадпрымальніцкі азарт. Іх цікавіла, што трэба зрабіць, каб атрымаць картку? І вось тут мы ўжо занепакоіліся, бо нашай мэтай было ўсё ж такі заахвоціць добрыя справы, ініцыятыву і ўнутраны парыў, а «эканамічны эфект» стаў для нас нечаканасцю.

Сталі думаць далей і прыдумалі... эканамічную гульню. Бірузовая картка за добрыя справы — гэта гісторыя канкрэтна «пра мяне», а эканамічная гульня — гісторыя пра ўвесь калектыў, пра фарміраванне каманды і кругавую падтрымку. У кожным класе ёсць летапісец, які вядзе падлік добрых спраў, картак і высокіх адзнак. Такім чынам індывідуальны вынік кожнага трансфармуецца ў «стэмбрыкі» — нашу ўнутраную валюту. За іх можна купіць ігравыя хады. Клас гуляе супраць класа. Спачатку яны гулялі ў «Сапёраў», потым — у «Марскі бой». Чым больш у вас «стэмбрыкаў», тым больш хадоў можна купіць, адпаведна, і шанцы выйграць таксама вышэйшыя. Напрыклад, цяпер каманды змагаюцца за права начлегу ў школе. Галоўнае, каб прызам было тое, што дзеці насамрэч вельмі жадаюць атрымаць. Асабліва важная матывацыя для старшакласнікаў, бо малодшыя школьнікі гатовыя гуляць проста дзеля самога працэсу.

Дарэчы, практыкуюцца ў гэтай школе таксама жоўтыя і чырвоныя карткі (як у футболе). Жоўтыя выдаюцца, напрыклад, за падман, абразы і хамства, пашкоджанне школьнай маёмасці. Чырвоныя — за бойку, зрыў урока. Дзевяць жоўтых картак эквівалентныя тром чырвоным. За іх можна атрымаць адхіленне ад вучобы на тыдзень, калі гэта здарылася першы раз у навучальным годзе. Ёсць і зялёная (выратавальная) картка. Яе можа выдаць злоснаму парушальніку клас або педагагічны калектыў. Аднакласнікі абмяркоўваюць сітуацыю, потым галасуюць за тое, ці трэба выратоўваць таварыша. І прымаюць сур'ёзнае каманднае рашэнне...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «ВАЛАНЦЁРСТВА НАТХНЯЕ!»

*(Заканчэнне. Пачатак 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Як куратар праекта я з навучэнцамі розных школ хадзіла ў госці да такіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Акрамя гэтага, мы разам наведвалі знакавыя мясціны ў горадзе, праводзілі майстар-класы, мастацкія выстаўкі. Адчуваю радасць і цяпло ад таго, што магу даць ім больш, чым уяўляецца, падзяліцца дабрынёй.

Гераіня канстатуе, што перад тым як сустракацца з дзецьмі, усім трэба прайсці сур'ёзную падрыхтоўку. Спецыялісты для валанцёраў заўсёды праводзяць трэнінгі, майстар-класы, інструктаж, дзе тлумачаць, як правільна паводзіць сябе з малымі, каб не нашкодзіць ім, як рэагаваць, што рабіць варта або не.

— У мяне ёсць аўтарскія распрацоўкі — увядзенне англійскай мовы ў валанцёрскую дзейнасць і колератэрапія. Дапамагаю дзецям развівацца фізічна і псіхалагічна праз візуалізацыю, колераву медытацыю, дыдактычныя гульні. У канцы навучальнага года атрымаю дыплом выхавальніка. А пакуль што працую выкладчыкам англійскай мовы ў дзіцячым садку № 46. Ва ўзаемадзеянні з малымі таксама дапамагае валанцёрскі вопыт, цяпер ведаю, як знайсці падыход да кожнага з іх, як развесяліць, пасябраваць. У далейшым думаю паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову на сурдапедагога або алігафрэнапедагога — сфера інклюзіі мне вельмі цікавая. А ўвогуле планую заставацца ў родным Магілёве, рабіць карысныя справы тут.



Анастасія лічыць, што валанцёрам можа быць кожны незалежна ад узросту і прафесіі, аднак ёсць пэўныя рэчы, на якія трэба звярнуць увагу.

— Павінна быць пачуццё абавязку, адказнасці, усведамленне таго, што на валанцёрскую дзейнасць будзе сыходзіць шмат часу. І галоўнае, каб жаданне дапамагаць ішло ад чыстага сэрца. Калі ты ўзяўся за гэтую справу, трэба ісці да канца. Валанцёрства, безумоўна, змяняе жыццё, твае прыярытэты і рысы характару. Калі раней не заўважала нейкіх маленькіх радасцяў, то цяпер усё па-іншаму. Асноўная асалода ад такой дзейнасці — аддача. Як вядома, валанцёры не разлічваюць атрымаць нічога ўзамен, але пасля добрых спраў заўсёды чуем словы падзякі. Валанцёрства дае карысны вопыт і новыя веды, цікавыя знаёмствы, сустрэчы з аднадумцамі. Форумы, круглыя сталы, семінары... Гэта натхняе і дае сілы на далейшае развіццё. Усе мае знаёмыя і сябры звязаны з валанцёрствам, паколькі яно ўключае шмат паездак і сустрэч, мы цесна кантактуем і згуртоўваемся. Астатнія навакольныя таксама рэагуюць на захапленне станоўча, бацькі падтрымліваюць. Калі я стала адной з пераможцаў у конкурсе «Валанцёр года — 2020», зразумела, што гэта вялікі стымул рухацца далей. Заўсёды прыемна, калі тваю работу заўважаюць і даюць высокую ацэнку, але падкрэслю, што ўсе валанцёры — дастойныя, няма лепшых і горшых. Наша работа аднолькава карысная і важная.



**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з асабістага архіва гераіні.**

*Новыя старты*

## Крочаць «Зімовым маршрутам»

**Беларускія студэнцкія атрады запусцілі патрыятычны праект, прымеркаваны да Года народнага адзінства**

**Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ даў старт новаму патрыятычнаму працоўнаму праекту «Зімовы маршрут», мерапрыемствы якога будуць рэалізаваны ў перыяд студэнцкіх зімовых канікул.**

Удзельнікамі праекта сталі зводныя студэнцкія атрады, байцы якіх праводзяць у малых гарадах і пасёлках Гродзенскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей шэраг прафарыентацыйных інтэрактываў, тэматычных занятках, канцэртных і сацыяльна значных праграм. Для арганізацыі інтэрактыўных гульняў з вучнямі пачатковай школы распрацавана серыя патрыятычных пазлаў, якія папулярызуюць сімвалы незалежнай Беларусі — Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг, а таксама размалёўкі «Беларусь памятае».

Падчас руху атрадаў зімовага маршруту байцы дапамагаюць у расчыстцы ад снегу помнікаў і абеліскаў, а таксама аказваюць адрасную шэфскую дапамогу па гаспадарцы ветэранам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, адзінокім пажылым людзям.

Афіцыйны старт «Зімоваму маршруту» даў атрад «Азімыя» ў Гродне на базе сярэдняй школы № 5. Ён сфарміраваны з ліку студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта. Яго байцы падрыхтавалі для школьнікаў займальную канцэртную праграму, арганізавалі інтэрактыўныя пляцоўкі аб дзейнасці БРСМ і беларускіх студэнцкіх атрадаў, тэматычныя фотазоны. Добры настрой і ўсмешкі дзецям дорыць танцавальны флэшмоб.

Пасля на «Зімовы маршрут» выйшлі атрады «Першы крок» (Віцебская вобласць) і «Ззянне» (Магілёўская вобласць).

Усяго атрады зімовага маршруту пераадолеюць 1662 кіламетры дарогі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Нябачныя масты*

# ЧАСОПІС ПРА... ЯПОНІЮ

**Адзінае такое выданне ў Беларусі пад назвай «Мурасакі» выпускаюць студэнты БДУ. Яно створана з мэтай папулярызацыі культуры і мастацтва гэтай краіны, а таксама ўдасканалення моўных і перакладчыцкіх навыкаў у студэнтаў.**



Фота прэс-службы БДУ.

У рэдакцыйны калектыў увайшлі другакурснікі факультэта міжнародных адносін (ФМА) спецыяльнасці «Лінгвакраіназнаўства» (японская група) Аляксандра Супрун, Аляксей Пінчук, Васіліна Броўка, Алёна Праведнік, Кацярына Блінцова, Дзмітрый Харытон, Дзмітрый Красkоўскі, Тамерлан Ягошын, Юлія Пятрова і Віталіна Сібірава. Галоўным рэдактарам выступае старшы выкладчык кафедры мовазнаўства і краіназнаўства Усходу Анастасія Панькова.

Часопіс «Мурасакі» з'яўляецца штомесячным 24-старонкавым электронным выданнем з забаўляльна-навінным кантэнтам. Пры яго падрыхтоўцы студэнты працуюць з арыгінальнымі матэрыяламі вядучых афіцыйных СМІ Японіі. Найлепшыя публікацыі будучыя лінгвакраіназнаўцы перакладаюць на рускую мову ў адпаведнасці з тэматычнымі рубрыкамі выдання: «Палітыка», «Эканоміка», «Спорт», «Культура», «Грамадства».

У раздзеле «Інтэрв'ю/асоба» студэнты размяшчаюць свае аўтарскія матэрыялы. Адзін з іх распавядае аб выкладчыку кафедры мовазнаўства і краіназнаўства Усходу ФМА Таматака Міюкі.

Забаўляльны змест «Мурасакі» дапаўняюць гараскопы, інфармацыя пра тэндэнцыі японскай моды і рэкамендацыі адносна папулярных анімэ і фільмаў. На дадзены момант для чытача даступныя тры нумары часопіса https://fir.bsu.by/departments/ol/ol-department-journal. Таксама плануецца выданне друкаванай версіі.

Падрыхтоўка спецыялістаў у галіне японістыкі вядзецца на ФМА з 2002 года ў рамках спецыяльнасці «Лінгвакраіназнаўства». Студэнты вывучаюць японскую мову, лінгвістыку, культуру, міфалогію, рэлігію, гісторыю, філасофію, эканоміку і палітыку. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «Усходазнавец-міжнароднік. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моў камунікацыі)». За 18 гадоў у БДУ па гэтым кірунку падрыхтавана звыш 50 прафесійных японістаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Мазгавы штурм*

## ЁСЦЬ ІДЭЯ? АТРЫМАЙ ПАДТРЫМКУ!

**У БДУ адкрыты новы сезон студэнцкага конкурсу стартапаў «Startup Heart».**

Ён скіраваны на стварэнне ўмоў для рэалізацыі бізнес-праектаў і аказанне дапамогі моладзі ў пошуку партнёраў або інвестараў. Узяць удзел у спаборніцтве могуць усе ахвотныя старшакласнікі, студэнты і маладыя спецыялісты да 30 гадоў. Свае ідэі або гатовыя праекты ў галіне ІТ, «разумнага горада», інтэлектуальных тэхналогій, адукацыі, сацыяльнага прадпрымальніцтва і іншых сферах прымаюцца да 21 сакавіка.

У гэтым годзе асаблівую ўвагу аддадуць ініцыятывам у галіне медыцынскіх тэхналогій, у прыватнасці, скіраваных на барацьбу з каранавіруснай інфекцыяй. Конкурсная праграма ўключае таксама правядзенне майстар-класаў і спікер-сесій з бізнесменамі і экспертамі. Гэта дазволіць удзельнікам удасканаліць і падрыхтаваць праекты да публічнай абароны ў маі гэтага года. Пераможцы спаборніцтва атрымаюць фінансавую падтрымку для рэалізацыі сваёй ініцыятывы.

Арганізатарам конкурсу выступае эканамічны факультэт БДУ. Упершыню мерапрыемства адбылося ў маі 2019 года. Па выніках двух сезонаў з 92 прадстаўленых праектаў 20 атрымала фінансавую падтрымку.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Майстар-клас*

## Цьютар для студэнта

**У БДУ упершыню з'явяцца спецыялісты, дзейнасць якіх будзе скіравана на індывідуалізацыю навучання і стварэнне ўмоў для раскрыцця творчага патэнцыялу студэнтаў.**

Сёння кожны факультэт універсітэта мае пералік унікальных адукацыйных і навуковых прапаноў, у ВНУ дзейнічае шэраг маладзёжных арганізацый, творчых калектываў і спартыўных секцый, аднак многім студэнтам складана сарыентавацца ў разнастайнасці паслуг. Цьютар з улікам персанальных запытаў студэнта зможа аказаць яму кансультацыйную і інфармацыйную падтрымку, калі той запланаваў навуковую работу міждысцыплінарнай накіраванасці — падбярэ яму найбольш перспектыўныя варыянты супрацоўніцтва з іншымі факультэтамі, сарыентуе ў галіне моўнай падрыхтоўкі і г. д. Па сутнасці, цьютары будуць выступаць пасярэднікамі паміж навучэнцамі і ўніверсітэтам.

Мяркуецца, што педагогі-цьютары будуць працаваць на кожным факультэце БДУ. Падрыхтоўка такіх спецыялістаў пройдзе ўпершыню ва ўніверсітэце ў рамках праграмы павышэння кваліфікацыі «Цьютарская суправаджэнне навучэнцаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі».

У БДУ аддаецца вялікая ўвага індывідуалізацыі навучання. З 2019 года паспяхова рэалізуецца праект па фарміраванні індывідуальнай адукацыйнай траекторыі, калі студэнт з улікам сваіх прафесійных пераваг можа выбраць для вывучэння дадатковыя навучальныя дысцыпліны, у тым ліку на іншых факультэтах. Цяпер такой магчымасцю ўжо скарысталіся 54 чалавекі. Дарэчы, адзін са студэнтаў быў атэставаны па пяці дысцыплінах, якія не ўваходзяць у асноўны навучальны план яго спецыяльнасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

SEX-БАЛЯСЫ

# ІМГНЕННАЯ КАРМА

**На жаль, усе мы крыўдзім адно аднаго... («Калі пчала некага джаліць, яна памірае. Вось бы і ў людзей так. Зрабіў гадасць — і ўсё...») Нехта выпадкова, хтосьці наўмысна. («Я не хацеў вас пакрыўдзіць. Проста выпадкова пашчасціла».) Бывае, па дробязі, здараецца, на ўсё жыццё. («Заўсёды рады! Але не тут. І не заўсёды. І не вам».) Кіраўніцтва раве на падначаленых. («— Як табе твой новы начальнік? — Строгі, але справядлівы: калі спачатку накрычыць, дык потым абавязкова знойдзе, за што».) Дзеці кпяць з таварышаў. («На ранішнік унук Алены Малышавай прыйшоў у касцюме тромба і спiнiў карагод».) Сужэнцы могуць арганізаваць такі «канцэрт»... («Раўнівая жонка прачытала паведамленні мужа ў «Фэйсбуку» і «лайкнула» яго патэльняй».)**

Я ўсё гэта да чаго? Усе ж чулі словазлучэнне «імгненная карма»? Гэтыя словы ўспрымаюцца як пакаранне, немінучае і вельмі хуткае па часе. («Мужык прыходзіць на работу з пластырам на лбе. Калегі ў яго пытаюцца: — Што здарылася? Той адказвае: — Жонка наліла баршчу, пачаў есці. Яна пытаецца, ці смачна. Я ў адказ: «Не, не смачна, а вельмі смачна!» Але не паспеў скончыць фразу».)



Вось адна з апошніх гісторый у тэму. Жыхар Омска ўстанавіў у сейфе пастку для мышэй, каб злавіць на крадзяжы сяброўку. («— Слухай, а ты давяраеш сваёй жонцы? — Ну так, мы ўжо два гады разам, бышчам бы нічога не прапала».) Па версіі следства, калі 35-гадовая жанчына гасцявала ў мужчыны, яна ўпотай адчыніла гаспадарскі сейф і ўкрала адтуль грошы і залаты бранзалет. («— Ну і дзе зарплата? — Укралі... — У якой такой... кралі?») Мужчына выявіў прапажу і вырашыў пры дапамозе згаданай прылады выкрыць зладзюжку. Ён устанавіў яе ў сейфе і зноў запрасіў жанчыну ў госці. Потым зрабіў выгляд, што спіць, а тая ў чарговы раз залезла ў сейф. («Страшэнная жаночая помста: «Каб ты ведаў... Я зрабіла гэты бутэрброд без любові!!!») Натуральна, прылада тут жа спрацавала... У дачыненні да зламысніцы была заведзена крымінальная справа, ёй пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі.

А гісторыю пра амерыканскага пажарнага, які не стаў тушыць дом былой жонкі, спасылаўшыся на рашэнне суда, чулі? Джым і Хелен пражылі разам амаль 15 гадоў. («Трыццацігадовы шлюб скончыўся гэтак жа, як і пачаўся: ён ударыў яе партфелем па галаве».) Але потым каханне прайшло, жанчына падала на развод і адсудзіла ў мужа амаль усю маёмасць. («Запіска мужу: «Я на цябе пакрыўдзілася. Пайшла гуляць з тваёй банкаўскай карткай. Ужо амаль табе даравала».) Акрамя таго, суд прыняў рашэнне аб тым, што Джыму і ўсім членам яго сям'і нельга набліжацца да Хелен бліжэй, чым на 500 метраў. («— Тата, я толькі што выпадкова трапіў каменем у суседскі «Лексус»! — Адыдзі, хлопчык, я цябе не ведаю!») А ўжо праз тыдзень дом жанчыны загарэўся. Выклік прыняла каманда ранейшага мужа, начальніка пажарнай ахоўы, і выехала на адрас. Але... За 500 метраў да жылля машына з пажарнымі спынілася. («Ты мая пенка ў какаве. У маннай кашы камячок. У цёплай булцы разынкі. Ненавіджу, карацей».) Джым не стаў тушыць узгаранне, забараніўшы рабіць тое і сваёй камандзе. Пакуль жанчына выклікала новую машыну, дом згарэў. («Алег здагадаўся, што справы ў фірмы, дзе ён працаваў, пагоршыліся, калі начальнік папрасіў яго схадзіць да ракі і набраць вады для кулера...») Пацярпелая падала на Джыма ў суд, каб той кампенсаваў ёй страты, але прайграла яго! Мужчына нагадаў пра ранейшае рашэнне судовай інстанцыі не набліжацца ні яму, ні членам яго сям'і да Хелен. А яго «супрацоўнікі яму як родныя», таму ўсе яны не мелі права парушыць такі загад.

Ну, гэта яшчэ «кветачкі». Здараецца, такія «ягадкі» бываюць... Справа была зноў жа ў Амерыцы. Там падмануты жаніх адпомсціў нявесце прама падчас урачыстасці, раздаўшы кожнаму з трохсот гасцей (апроч непаўналетніх) канверты з доказамі яе здрады. («Мая жонка спытала, з якой колькасцю жанчын я спаў. Я горда адказаў, што толькі з ёй, а з астатнімі быў у прытомнасці. Гадзіны наведвання ў бальніцы — з 10 да 17».) Пасля папрасіў ускрыць іх. Унутры было па адной фатаграфіі. На ёй нявеста займалася сексам з сябрам жаніха... І гэты «сябра» таксама прысутнічаў сярод гасцей і, як і ўсе, атрымаў канверт. Аказалася, што малады чалавек яшчэ падчас развіцця стасункаў з дзяўчынай нешта западозрыў. («Як за паўтары хвіліны можна было зразумець, што я дрэнны каханак, а???») Каб развеяць сумненні, ён наняў прыватнага сышчыка. Апошні і зрабіў тую самую фатаграфію... Пасля «нямой сцэны» жаніх з усімі развітаўся: «Гэта не маё вяселле, я сыходжу». («Пасля кансультацыі ў псіхолага Іры ўдалося вярнуць мужа ў сям'ю. У сям'ю, дзе ён вырас».) Як той казаў, застаецца толькі пазайздросціць такім цярпенню і вытрымцы. Што ж, карма бывае не толькі імгненная. Помста, як сведчыць народная мудрасць, павінна падавацца халоднай...

Таму лепш за ўсё — скінуць нават саму магчымасць такой ка́рмы за карму́ жыцця і ісці па ім правільным і шчырым курсам. («Памочнік кажа капітану карабля: — Па курсе судна — айсберг. Капітан: — Айсберг па курсе карабля? Неяк дарагавата будзе!») Як паказваюць вышэйзгаданыя прыклады, дрэнныя ўчынкі і паводзіны могуць дорага каштаваць. Таму рабіце толькі добрае!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «БОКС ЗАМЯНІЎ НА ПЕСНІ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Да цяперашняга часу падтрымліваю сувязь са сваімі былымі калегамі па рынгу — румынскім баксёрам, чэмпіёнам свету Марыянам Сіміёнам, кубінцам, чатырохразовым чэмпіёнам свету, двойчы сярэбраным прызёрам летніх Алімпійскіх гульняў Хуанам Эрнандэсам С'ерам, украінцам, сярэбраным прызёрам чэмпіяната свету сярод аматараў 1997 года, двухразовым прызёрам чэмпіянатаў Еўропы Сяргеем Дзінзіруком і двухразовым алімпійскім чэмпіёнам, чэмпіёнам свету і Еўропы Алегам Саітавым — вось тая чацвёрка, якая курсіравала са мной па Алімпіядзе, чэмпіянатах свету і Еўропы. Вельмі таленавітыя хлопцы, мае сябры, калегі, блізкія мне па духу людзі.

Цяпер я артыст, і скажу, што мае паядынкі былі ў нечым таксама артыстычныя *(смяецца)*. Як некалі гледачы чакалі выступленняў знакамітых Косці Цзю, баёў Роя Джонса, Мухамеда Алі, падобна да гэтага людзі чакалі і майго — збіраліся поўныя залы. У мяне ніколі не было мэты знявечыць ці збіць да непрытомнасці свайго апанента. Да бою, як правіла, ты ўжо ведаеш, з кім прыйдзецца выступаць, і, вядома, разумееш: альбо ты яго, альбо ён цябе. І тут ужо ўключаюцца і жорсткасць, і ўсё тое, чаму навучылі. Увогуле спорт вучыць дасягаць сваіх мэт, быць упартым. Калі ты спартсмен, які імкнуўся да сапраўдных вяршынь, то спорт цябе загартоўвае, нездарма многія былыя атлеты становяцца бізнесменамі, трэнерамі, займаюць кіруючыя пасады.

**— Скажыце, а ці можна параўнаць вашы адчуванні перад выхадам на сцэну з тымі, што з'яўляюцца на рынгу?**

— Яны амаль аднолькавыя — мандраж, перадстартавая ліхаманка. Хочацца ж быць прыгажуном, хочацца выйграць. А што такое сцэна? Гэта выступленне, прычым часта ўжывую, ну і з'яўляюцца перажыванні, асабліва калі псіхалагічна непадрыхтаваны. Напрыклад, мала канцэртаў, выступленняў, гастрольных тураў — атрымліваецца, як і ў спартсменаў: недастаткова трэніраваўся. Гэта называецца вопыт, будзе ён — атрымаеш і ўпэўненасць, не з'явіцца залішняга хвалявання, адчуеш толькі станоўчыя эмоцыі!

**— Раскажыце, як вы перайшлі са спорту ў творчасць?**

— Гэтае пытанне мне задаюць пастаянна *(смяецца)*. Я заўсёды спяваў, калі быў маленькі, нават хадзіў «на трубу» і, вядома, на розныя віды спорту, тады часта трэнеры прыходзілі ў школу і запрашалі дзяцей займацца да сябе. Заўсёды са мной «ездзіў» вялікі магнітафон альбо плэер. Калі з камандай выпраўляліся на зборы — у Ялту, Алушту і іншыя гарады — на набярэжных спявалі там у караоке, я заўсёды збіраў натоўпы людзей вакол сябе. Пасля таго як пакінуў спорт у 2006-м, добры сябар, прафесіянал дыктарскага майстэрства, які цяпер працуе на магілёўскім радыё і тэлебачанні, Анатоль Шпількоў пазнаёміў мяне з Уладзімірам Каньковым, які, на жаль, пайшоў з жыцця, ён быў гукарэжысёрам Іскуі Абалян. Той у свой час пазнаёміў з вядомым прадзюсарам, мастацкім кіраўніком «Залатога шлягера» Андрэем Калінам. Так і пайшло: рабілі сваю аранжыроўку на знакамітыя савецкія хіты пра спорт, алімпіяду, выконваў песні А. Пахмутавай, І. Капланава, М. Бернэса і іншыя, былі і аўтарскія музычныя творы, з якімі выступаў на стадыёнах, рознага кшталту дабрачынных канцэртах. Тады пазнаёміўся з кампазітарам Жэнем Алейнікам, яго жонкай, паэтэсай і спявачкай Юліяй Быкавай (гурт «AURA»), з паэтэсай Зояй Гарынай, Дзмітрыем Дэрвішам... З Жэнем, дарэчы, мы напісалі шмат добрых песень «Гэта наш час», «Ты — чэмпіён» і іншыя, рабілі аранжыроўкі, выпусцілі шэраг цудоўных кампазіцый для радыёфармату, працягваем супрацоўнічаць і далей. Так і пайшоў у мяне рух: я пачаў актыўна запісваць сінглы, здымаць кліпы, у свой час правёў цудоўны сольны канцэрт у Палацы Рэспублікі. Вельмі ўдзячны былому мастацкаму кіраўніку заслужанага аркестра народных інструментаў імя Л. Л. Іванова Мікалаю Алданаву, дзякуючы якому мой музычны вечар быў яркі і запамінальны, хочацца падзякаваць усім артыстам і музыкантам, якія бралі ўдзел у канцэрце, асобная падзяка Уладзіславе Арцюкоўскай, а таксама Іне Мардусевіч за тое, што паверылі ў мяне, як калісьці паверылі ў мяне мае трэнеры. Зараз нараджаецца новая песня «Ты не мая», над якой працуем разам з творчай камандай. Таксама нядаўна выйшаў рэмікс на песню «Акіян», а найцудоўнейшая кампазіцыя для розных узростаў «Памачым на зоркі» ўжо ёсць на ўсіх музычных пляцоўках — і ў iTunes, і ў Shazam. Многім вядомыя і мае іншыя, не менш яркія музычныя творы — «Я на сэрцы напішу», «Некалькі радкоў», «Мая любімая жанчына»...

**— Як падбіраеце рэпертуар?**

— Ёсць такія кампазітары, якія пішуць не дзеля грошай — для іх проста важна даць свайму твору жыццё. Мне ж асабіста падабаецца працаваць з такімі з іх, як Андрэй Сланчынскі, Павел Берташ, выдатна супрацоўнічаем з гомельскімі творцамі, кампазітарамі і прадзюсарамі — Валерыем Шоманам, Дзянісам Буфам, які, дарэчы, стаяў каля вытокаў напісання знакамітага «Чорнага бумера», з Аляксандрам Івановым, больш вядомым як IVAN, — вельмі таленавітыя хлопцы.



**На ўрачыстым адкрыцці традыцыйнага турніру на прызы алімпійскай чэмпіёнкі Святланы Баітавай па спартыўнай гімнастыцы.**

Песні выбіраю зыходзячы выключна з маіх музычных прыхільнасцяў, калі мне падабаецца, то я абавязкова буду яе выконваць. Звычайна параўноўваю музычную кампазіцыю з машынай, яна таксама павінна быць прыгожая і цудоўная, як аўтамабіль класа люкс *(смяецца)*. Прыгадваю, як аднойчы на канцэрце ў Гомелі спявак IVAN, якога, дарэчы, прадзюсіруе знакаміты Віктар Дробыш, мне сказаў: «Добра, калі ў выканаўцы ёсць свой хіт — гэта зялёнае святло». Таму я, як і любы артыст, у пошуку свайго хіта, хоць у мяне ёсць шмат ёмістых песень, такіх, напрыклад, як «Абыдуся» — усе жанчыны на канцэртах звычайна просяць яе выканаць *(усміхаецца)*.

**— Вадзім, неяк вы сказалі, што ў жыцці вам нічога не даставалася лёгка, сустракаліся складанасці. Што дапамагае з імі спраўляцца і зноў кідацца ў бой?**

— Характар, які генетычна закладзены бацькамі і выхаваны спортам. Найлепшая помста — ігнараванне, а ўсё астатняе Бог расставіць па сваіх месцах. Я заўсёды стаўлю сабе амбіцыйныя мэты, нездарма за плячыма алімпіяда, чэмпіянат свету і Еўропы, і ўдзячны лёсу, што на маім жыццёвым шляху сустракаюцца такія ж амбіцыйныя людзі, як і я.

**Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з асабістага архіва спевака.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 27.01.2021 г.

# Падмурак Трэцяга Рэнесансу закладваецца ва Узбекістане



**У гістарычным лёсе кожнага народа ёсць імёны вялікіх асветнікаў, зорнасць якіх навідавоку і праз стагоддзі. У беларусаў гэта — Францыск Скарына, паэты Якуб Колас і Янка Купала, класік беларускай нацыянальнай літаратуры XX стагоддзя Уладзімір Караткевіч. Ва ўзбекскім пантэоне легендарных асветнікаў асаблівае месца займае Алішэр Наваі. Юбілей вялікага паэта, 580-годдзе з дня яго нараджэння, Узбекістан, узбекістанцы адзначаюць і ў сябе на Радзіме, і па ўсім свеце. Да гэтай яркай асобы, асэнсавання яе месца ў сусветнай культуры спрычыніўся і наш суайчыннік — Дзмітрый РАДКЕВІЧ. Ён пагадзіўся адказаць на некаторыя пытанні «Звязды». А нагодай, акрамя іншага, стала яшчэ і нядаўняя паездка спадара Дзмітрыя ў Ташкент, дзе прайшлі Тыдзень культурнай спадчыны Узбекістана і IV Міжнародны кангрэс Сусветнага таварыства па вывучэнні, захаванні і папулярызацыі культурнай спадчыны Узбекістана «Культурная спадчына Узбекістана — падмурак новага Рэнесансу». Усе ўдзельнікі гэтай маштабнай падзеі — прадстаўнікі навукі і культуры — аднагалосна прынялі зварот да прэзідэнта краіны Шаўката Мірзіёева. Тыдзень культурнай спадчыны Узбекістана паднёс шмат сюрпрызаў удзельнікам, гасцям з-за мяжы і наведвальнікам. Аспірант Інстытута мовазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, бакалаўр тэалогіі, магістр гістарычных навук, Старшыня Рады ўлемаў Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь Дзмітрый Радкевіч браў удзел літаральна ва ўсіх знакавых мерапрыемствах гэтага Тыдня культурнай спадчыны Узбекістана.**

***— Спадар Дзмітрый, вы зусім не выпадкова трапілі на свята нацыянальнай культуры, нацыянальнага асветніцтва Узбекістана... У сваёй творчай, навуковай рабоце вы праяўляеце надзвычайную цікавасць да культуры гэтай краіны...***

— Так. Але ж хацелася б, паколькі я пад велізарным уражаннем ад паездкі, расказаць пра ўсё па парадку. Прайшло больш за месяц, а пачуцці перапаўняюць мяне.

Па-першае, падкрэслю, што мой візіт адбыўся ў межах Тыдня культурнай спадчыны Узбекістана і IV Міжнароднага кангрэса Сусветнага таварыства па вывучэнні, захаванні і папулярызацыі культурнай спадчыны Узбекістана «Культурная спадчына Узбекістана — падмурак новага Рэнесансу». За гэта вельмі ўдзячны амбасадзе Узбекістана ў Беларусі, дзе аддаюць асаблівую ўвагу разгортванню, пашырэнню беларуска-ўзбекскіх гуманітарных, культурных сувязяў. Такі падыход да дыпламатыі, такая культурная, народная дыпламатыя толькі спрыяюць сапраўднай дружбе паміж Беларуссю і Узбекістанам.

Галоўнай мэтай майго візіту было выступленне на міжнародным кангрэсе. Гэта ключавое мерапрыемства Тыдня стартавала 15 снежня 2020 года ў будынку Палаца моладзі. У ім узялі ўдзел прадстаўнікі міжнародных арганізацый, звыш 300 замежных навукоўцаў больш чым з 40 краін свету, а таксама каля тысячы экспертаў і ўдзельнікаў з Узбекістана. Два першыя дні былі адведзены пад даклады замежных навукоўцаў, прысвечаныя раскрыццю каштоўнасці культурнай спадчыны Узбекістана.

Вядомыя ўсходазнаўцы падзяліліся яскравымі і нават сенсацыйнымі вынікамі сваіх шматгадовых даследаванняў пра ўклад найвялікшых мысліцеляў узбекскай зямлі ў развіццё сусветнай цывілізацыі, магутны ўсплёск навукова-культурнага ўздыму падчас Першага і Другога Рэнесансаў. Гэтыя вялікія этапы гісторыі культуры і навукі адбываліся прыблізна ў X і XV стагоддзях, стаўшы ўнікальнымі перыядамі ў гісторыі ўсяго чалавецтва і спарадзіўшы атмасферу асветы, рэлігійнай талерантнасці і гуманізму. Вось і атрымліваецца, што цяпер ва Узбекістане за кошт надзвычайнай увагі да нацыянальнай культуры, вызначэння яе месца ў сусветным кантэксце рупяцца пра Трэці Рэнесанс...

***— Кангрэс, наколькі я разумею, акрэсліў кантакты ўзбекскай культуры з культурамі народаў і краін Усходу, найперш — з культурамі краін Цэнтральнай Азіі?..***

— Безумоўна. Немагчыма пераацаніць уклад Узбекістана і яго грамадства ў развіццё і захаванне культуры рэгіёна, ды і ўсяго свету. Упершыню, дарэчы, ініцыятыва па стварэнні адмысловага таварыства прагучала менавіта ў Ташкенце, у маі 2017-га на Міжнародным кангрэсе «Культурная спадчына Узбекістана — шлях да дыялогу паміж народамі і краінамі». Рашэнне аб стварэнні Сусветнага таварыства па вывучэнні, захаванні і папулярызацыі культурнай спадчыны Узбекістана было прынята ў рамках II Міжнароднага кангрэса ў Санкт-Пецярбургу ў 2018 годзе. Гэтая арганізацыя садзейнічае міжнароднаму супрацоўніцтву самых розных дзяржаўных і грамадскіх структур, даследчыкаў, экспертаў, прадстаўнікоў навукі, медыясферы і іншай зацікаўленай грамадскасці ў галіне захавання, вывучэння і папулярызацыі культурнай спадчыны Узбекістана ў кантэксце сусветнай культуры. Гэта вельмі адказная і значная работа, і Узбекістан бліскуча яе выконвае. Тым больш што праблема захавання культуры набывае ў апошні час усё больш глабальны характар.

Цэлы раздзел работы ў межах гэтай важнай падзеі для жыцця краіны быў адведзены тэме захавання і аднаўлення культурнай спадчыны ўзбекскага народу, а таксама вывучэнню сусветнага досведу ў гэтым кірунку. За адносна невялікі тэрмін згаданая сфера істотным чынам змянілася, чаму спрыяла прынцыпе і цэлага шэрагу пастаноў кіраўніка дзяржавы і ўрада, у якіх зацверджаны асноўныя змяненні, накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці работы ўсіх датычных асоб і структур.

Краіна аддае вялікую ўвагу будаўніцтву падмурка Трэцяга Рэнесансу. Гэта новы крок да стварэння цывілізацыйных перадумоў для прагрэсу і росквіту ў рэгіёне. Імёны сотняў вялікіх навукоўцаў, якія ў Сярэднявеччы ззялі на небасхіле сусветнай думкі, цяпер адкрываюцца наноў праз якасныя пераклады іх твораў на нашу мову. Захаванне культурнай спадчыны — гэта свядомы клопат пра сваю Радзіму і культуру.

***— І ўсё ж, на што вы, госць з Беларусі, звярнулі ўвагу ў сваім выступленні на кангрэсе?***

— Маё выступленне было прысвечана захаванню памяці пра творчасць Алішэра Наваі ў Беларусі. Асобныя пераклады вершаў Наваі ў свой час зрабіў Васіль Жуковіч, яны выйшлі ў зборніку «Лірыка» ў 1993 годзе. Ведаю, што беларускі паэт ездзіў у Ташкент, знаёміўся з даследчыкамі творчасці Наваі. Летам 2019-га ў Мінску быў адкрыты бюст апошняму, створаны па праекце маладога беларускага скульптара Максіма Макарэвіча. Вядома, у маім выступленні быў зроблены акцэнт на перакладзе суфійскага трактата Наваі «Махбуб ул-кулуб». Словазлучэнне гэтае — з арабскай мовы і абазначае пэўны стан, калі на некага накіравана любоў (хуб) сэрцаў (кулуб). Таму назву я пераклаў выразам «Улюбёны сэрцаў». Сам трактат напісаны на стараўзбекскай (цюркскай) мове, перасыпанай персідскімі і арабскімі словамі і выразамі. На такой мове ў сучасным Узбекістане ніхто цяпер не размаўляе, але тады, у 1500 альбо 1501 годзе, гэта была новая, надзвычай нечаканая з'ява. Да таго ж цюркская мова тады лічылася недастатковa «гарадской» — нашмат больш увагі аддавалася тым самым персідскай і арабскай мовам. Таму творчасць Алішэра Наваі стала сапраўднай рэвалюцыяй у тагачасным культурным асяроддзі, уславіўшы на вякі імя паэта.

***— Раскажыце, калі ласка, пра сам твор, пераклад якога, наколькі я ведаю, у хуткім часе выйдзе ў Беларусі асобнай кнігай...***

— Трактат Наваі вельмі складаны ў плане мовы, але разам з тым вельмі даступны ў плане зместу. Структура твора трохчастковая: першая — своеасаблівая галерэя характараў розных катэгорый людзей, другая — апісанне дзесяці ступеняў духоўнага росту, трэцяя — кароткія замалёўкі і заўвагі, якія так ці інакш звязаныя з асноўнай тэмай. У канцы мы далучылі слоўнік, у якім прывялі тлумачэнне ісламскіх і ўсходніх тэрмінаў, а таксама далі кароткія біяграфічныя звесткі пра згаданых у кнізе асоб.

***— Не баяліся пачынаць такую складаную творчую работу?***

— Яна была б немагчымая без атрымання належнай базы — вышэйшай гістарычнай і тэалагічнай адукацыі. Веды далі магчымасць зірнуць на тэкст не толькі як на помнік літаратуры, але і як на карысную для развіцця светапогляду і практычнага прымянення кнігу. Асобныя часткі з яе ўжо апублікаваныя ў часопісе «Байрам», які выдаецца сіламі Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь невялікім накладам. Чакаю з нецярпеннем і беларускую кнігу з трактатам. Яна выходзіць у мінскім выдавецтве «Белпрынт».

***— Што вас яшчэ захапіла, уразіла на кангрэсе?***

— Адным з цікавых знаёмстваў стала сустрэча з даследчыкам з Нью-Дэлі, спецыялістам Цэнтра персідскіх і цэнтральнаазіяцкіх даследаванняў: гэта — Сайед Накі Абас, які ўдзельнічаў у вывучэнні рукапіснай спадчыны Узбекістана, што захоўваецца ў Індыі. Таксама адбылася грунтоўная размова з загадчыкам аддзела даследаванняў і публікацый гістарычных дакументаў Інстытута ўсходазнаўства імя Абу Райхана Біруні Акадэміі навук Рэспублікі Узбекістан Санджарам Гуломавым. Яму ў падарунак былі перададзены нумары часопіса «Байрам», якія змяшчаюць фрагменты перакладу трактата Алішэра Наваі на беларускую мову.

***— Што найбольш запомнілася з работы кангрэса?***

— Кульмінацыйным момантам Тыдня культурнай спадчыны Узбекістана і IV Міжнароднага кангрэса «Культурная спадчына Узбекістана — падмурак новага Рэнесансу» стала аднагалоснае прыняцце звароту ўдзельнікаў Сусветнага таварыства да Прэзідэнта Рэспублікі Узбекістан Шаўката Мірзіёева. Ініцыятыва прагучала з боку навукоўцаў з Японіі, якія ўдзельнічалі ў рэжыме анлайн. Знаходзячыся ў будынку тамтэйшага Пасольства Узбекістана, аж 20 спецыялістаў падрыхтавалі праект звароту, які пасля падтрымалі члены праўлення і навуковага савета таварыства. У звароце яны падзякавалі кіраўніку рэспублікі за садзейнічанне ў рэалізацыі ініцыятывы аб перадачы дзесяці тысяч асобнікаў 35 тамоў кніг-альбомаў з серыі «Культурная спадчына Узбекістана ў зборах свету» бібліятэкам і навучальным установам іх краіны. Дзякуючы актыўнай рабоце сотняў усходазнаўцаў, у хуткім часе кніг-альбомы аб культурнай спадчыне Узбекістана ў зборах музеяў і калекцыянераў Узбекістана, Расіі, ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Турцыі, Чэхіі, Японіі і многіх іншых краін атрымаюць усе бібліятэкі, агульнаадукацыйныя школы і ВНУ Узбекістана. Варта падкрэсліць, што падтрымку ў гэтай справе аказвае ўрад краіны.

